Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №105 (28469)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Замест стыхійных дач — сквер**

СТАР. 7



**У госці да Рэпіна**

СТАР. 9



**Інтэрв'ю з найлепшай дзюдаісткай краіны**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У краіне дастаткова гаспадарак дзяржаўнай формы ўласнасці, якія эфектыўна працуюць. Тут і культура арганізацыі працы высокая, і зарплата годная. Мы ведаем нямала прыкладаў, калі прыватнік станавіўся банкрутам, гэта паказвае і вопыт іншых краін. Таму па вялікаму рахунку нармальная праца ў сферы аграпрамысловага комплексу залежыць не ад формы ўласнасці, а ад чалавека, кіраўніка. Важна правільна арганізаваць вытворчы працэс, тады будзе багацейшай гаспадарка, будзе багацейшай і краіна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8650 | ▼ |
| Еўра | 2,1012 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# На адной хвалі



Фота БЕЛТА.

У суботу ў Мінску прайшоў масавы касцюміраваны заплыў. Каля 30 сабсёрфераў у карнавальных касцюмах выйшлі на ваду, па Свіслачы яны пераадолелі шлях ад Палаца спорту да парку Горкага і назад. Акрамя выдуманых персанажаў, знайшліся і сапраўдныя — жаніх і нявеста. Эдуард і Аляксандра проста на беразе ракі заключылі шлюб і адправіліся ў заплыў ужо мужам і жонкай.

■ Фестывалім!

XVII Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі Маладзечна-2017

## Месца сустрэчы талентаў

**Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2017» сёлета прайшоў 17-ы раз. Пэўна, у такім супадзенні лічбаў ёсць свой сімвалізм. Быццам замкнулася кола — добрыя традыцыі эстрады на роднай мове, пачатак якім быў пакладзены ў 1993 годзе, захоўваюцца і сёння. Ці сапраўды ўдаецца фестывалю годна трымаць высокую планку, пастаўленую раней, і ці адпавядае ён сучасным патрабаванням, даведаліся тыя, хто гэтымі днямі наведаў Маладзечна.**

СТАР. 4




Падвядзенне вынікаў конкурсу маладых выканаўцаў.

■ Тэндэнцыя

## МАЛАДЫ І ПАСПЯХОВЫ

### 28-гадовы дырэктар кіруе гаспадаркай і выхоўвае трох сыноў



**Сяргей ГАРБАЧЭЎСКІ ўзначальвае раённае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Першы Беларускі», што на Вілейшчыне, і выхоўвае трох сыноў. Гаспадарка не малая, але малады дырэктар спраўляецца. У рабочым кабінеце затрымліваецца рэдка, пасля ранішняй планёркі — на поле, ферму, заўсёды на людзях і з людзьмі.**

Сяргей Аляксандравіч не з тутэйшых, нарадзіўся ў Ваўкавыску, што на Гродзеншчыне. Пасля школы закончыў каледж па спецыяльнасці эканаміст-менеджар. Працаваў у сельгасарганізацыі «Зара і К» і адначасова вучыўся ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. Сяргею Гарбачэўскаму прапанавалі рэалізаваць свой талент на Вілейшчыне. І ён пагадзіўся. Спачатку яго прызначылі намеснікам старшыні па агульных пытаннях адкрытага акцыянернага таварыства «Сцешыцы», пасля аб'яднання гаспадаркі з «Першым Беларускім» — выконваючым абавязкі дырэктара, а затым і дырэктарам.

Справы ў гаспадарцы на той час не ладзіліся: даўгі, недахоп тэхнікі, запчастак, угнаенняў, нізкія прыбаўленні ў вазе, надоі. І гэта зразумела. Малако, як кажуць, у каровы на языку. А кармавая база была дрэнная: нарыхтавалі недастаткова сенажу з-за дэфіцыту культурных траў, пасевы якіх выкарыстоўваліся па 10 і больш гадоў. Таму летась засеялі 900 гектараў канюшынай, люцэрнай, што дасць магчымасць назапасіць удосталь кармоў, а значыць, і прыбавіць у надоях. Ініцыятыўнасць маладога кіраўніка, прадуманы падыход да справы ўжо даюць добрыя вынікі.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Тры пытанні да ўлады

# ПРАЦЫ БОЛЬШ, ЧЫМ АХВОТНЫХ

## Калінкавіцкі раён гатовы прапанаваць новае працоўнае месца кожнаму



**Раён знаходзіцца ў цэнтры Гомельскай вобласці. Замежжа недалёка, Мінск таксама — размяшчэнне спрыяе развіццю тэрыторыі, але і адцягвае кадры. Старшыня Калінкавіцкага райвыканкама Іван ПІЛІПЕЦ расказаў, чым мясцовыя ўлады зацікаўліваюць жыхароў заставацца на малой радзіме.**

***— Каб людзі не з'язджалі, неабходна даць ім магчымасць працаваць. Колькі новых працоўных месцаў створана апошнім часам?***

— Летась у эканоміку раёна было інвеставана 75 млн рублёў і створана 194 працоўныя месцы. Гэта на 54 больш, чым планавалася. За першы квартал 2017 года аб'ём інвестыцый склаў 22 млн рублёў, створана 61 працоўнае месца. Людзей уладкоўваем і на новыя, і на дзеючыя прадпрыемствы. Вядома, хацелася б адкрыць і буйную вытворчасць — мы прапаноўваем пад яе плошчы, але пакуль пакупнікоў не знайшлі.

У мінулым годзе больш за 50% створаных месцаў былі ў галіне гандлю. Узровень беспрацоўя на 1 мая 2017 года склаў 1,1% да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Год таму на 307 беспрацоўных было 264 вакансіі. Цяпер сітуацыя змянілася. У нас зарэгістраваны 264 беспрацоўныя, і ім прапанавана 278 працоўных месцаў. Пачынаючы са студзеня мы правялі восем мінікірмашоў вакансій у сельсаветах і адзін буйны — у раённым цэнтры. На ім прысутнічала 28 арганізацый, гатовых наняць новых супрацоўнікаў. Грамадзяне маглі пакінуць свае рэзюмэ і атрымаць інфармацыю аб вакантных пасадах. Мы таксама прапаноўвалі кансультацыі па юрыдычных пытаннях у адкрыцці сваёй справы і па арганізацыі навучання па запатрабаваных прафесіях.

***— І многія адважваюцца адкрыць свой бізнес?***

— У Калінкавіцкам раёне 1279 суб'ектаў малога бізнесу, з іх — 950 індывідуальных прадпрымальнікаў. Летась было зарэгістравана 145 новых ІП і 15 юрыдычных асоб. Пераважна яны з'явіліся ў сферы паслуг і гандлі. Напрыклад, «КСТСтрой» займаецца будаўніцтвам, і, дарэчы, на ім было створана 22 новыя працоўныя месцы. Развіццё малога бізнесу — перспектыўна для раёна. Мы можам даць пад яго маёмасць, якая цяпер выкарыстоўваецца неэфектыўна. Сёлета мы прадалі ізаляванае памяшканне ў горадзе, якое амаль дзесяць гадоў не эксплуатавалася. Аб'ект пасля рэканструкцыі плануецца выкарыстоўваць пад сферу паслуг, стварыць там 15 працоўных месцаў. Увогуле летась мы прадалі аб'ектаў на 140 000 рублёў. Вопыт паказвае, што людзям гэта цікава, калі прапанаваць добрыя ўмовы. Прадпрыемства «Усходні пекар» у 2015-м набыло будынак у былым вайсковым гарадку Бабровічы і пераехала туды з Мінскай вобласці. Сёлета заснавальнік арганізаваў у адрамантаваным будынку вытворчасць хлебабулачных вырабаў, створана шэсць працоўных месцаў.

***— Пра што пытаюцца жыхары раёна падчас прамых тэлефонных ліній?***

— Часам нашы грамадзяне пытаюцца пра выдзяленне зямельных участкаў. Мы прадалі больш за сто аб'ектаў нерухомасці ў раёне пад розныя мэты. У кагосьці атрымалася вядзенне бізнесу, у кагосьці не. Тут ужо залежыць ад гаспадара. З пачатку гэтага года па прамых тэлефонных лініях нам паступіў 41 зварот. У асноўным людзі цікавяцца прыборкай вуліц, рамонтам жыллёвага фонду, дарожнага пакрыцця, часам пытаюць пра разлікі за жыллёва-камунальныя паслугі і аплату за здадзенае малако. Большасць пытанняў вырашаем аператыўна.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Падзея

# АГРАРЫІ З УСЯГО СВЕТУ ЕДУЦЬ ДА НАС

**27-ы раз выстаўка «Белагра-2017» раскрывае свае дзверы для наведвальнікаў. Сёлета ў ёй удзельнічаюць больш за 500 кампаній з 25 краін свету. Таксама, па словах першага намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда МАРЫНІЧА, у выставачных мерапрыемствах прыме ўдзел 21 афіцыйная замежная дэлегацыя.**

Выстаўка праходзіць з 6 па 10 чэрвеня ў гандлёва-лагістычным цэнтры «Глобус», што знаходзіцца ў аграгарадку Шчомыслiца ў Мінскім раёне. Упершыню яна праводзіцца на адзінай тэрыторыі. Падчас выстаўкі пройдзе больш за 20 тэматычных семінараў.

Упершыню сёлета праводзіцца адкрыты аўкцыён племянных жывёл. Найлепшыя племянныя гаспадаркі краіны прадаюць не толькі буйную рагатую жывёлу, але і авечак, свіней, птушак. Леанід Марыніч выказаў надзею, што гэта дасць штуршок, каб вызначыць іх рэальны кошт. Асаблівасць гэтага года — традыцыйны конкурс аратых — атрымае статус міжнароднага, бо ўдзел у ім прымуць не толькі каманды з Беларусі, але і з Расіі і Казахстана. Акрамя таго, на «Белагра-2017» пройдзе конкурс прадпрыемстваў харчовай прамысловасці "Чэмпіён смаку». Ахвотныя пазнаёміцца з беларускай рыбалоўнай галіной змогуць гэта зрабіць на ўжо традыцыйнай секцыі «Рыбацкая вёска».

* * *

Як адзначыў першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Марыніч, першы беларуска-афрыканскі форум «Беларусь і Афрыка: новыя гарызонты», які адбываецца 6—7 чэрвеня, арыентаваны на аграпрамысловае супрацоўніцтва дзвюх краін. Адкрыццё Беларусі прыцягвае афрыканскі бок у пытаннях развіцця гэтай сферы. Для ўдзельнікаў форуму ўжо распрацавана вялікая праграма. У ёй — наведванне малака- і мясаперапрацоўчых прадпрыемстваў, а таксама мадэрнізаваных сельгасаб'ектаў, у прыватнасці зернесушыльных комплексаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Бесчалавечнасці няма апраўдання



Групоўка «Ісламская дзяржава» ўзяла на сябе адказнасць за напад на людзей у Лондане. Пра гэта паведамляе Reuters са спасылкай на інтэрнэт-рэсурсы тэрарыстаў.

«Атрад байцоў «Ісламскай дзяржавы» здзейсніў атаку ў Лондане», — гаворыцца ў заяве.

Трое мужчын на аўтамабілі ўчынілі наезд на пешаходаў у раёне Лонданскага моста, пасля чаго даехалі да рынку Баро, дзе выскачылі з машыны і з нажамі сталі нападаць на прахожых. Злачынцы былі ліквідаваны паліцыяй. У выніку нападаў, па апошніх даных, загінулі сем чалавек, пацярпелі 48. Паліцыя затрымала 12 падазраваных. У горадзе ўзмоцнены меры бяспекі. У сталіцу Вялікабрытаніі сцягнуты дадатковыя сілы паліцыі.

Гэта ўжо трэці тэракт у Лондане за апошнія тры месяцы.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з тэрактам у цэнтры Лондана ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў шчырыя спачуванні родным і блізкім загінулых, пажаданні хутчэйшага выздараўлення пацярпелым, а таксама словы падтрымкі Прэм'ер-міністру Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Тэрэзе Мэй і ўсяму народу гэтай краіны.**

**Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што вестка пра тэракт была ўспрынятая ў Беларусі з глыбокім болем і смуткам. «У апошні час Вялікабрытанія перажыла шэраг нападаў з боку экстрэмістаў. Перакананы, што няма і не будзе апраўдання дзеянням, у выніку якіх гінуць мірныя грамадзяне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

У брытанскім урадзе 6 чэрвеня прайшла хвіліна маўчання ў памяць аб загінулых падчас апошняй атакі тэрарыстаў.

ІД З чэрвеня размясціла заклік да сваіх паслядоўнікаў здзяйсняць напады з дапамогай грузавікоў, нажоў і агнястрэльнай зброі супраць «крыжакоў» падчас святога для мусульман месяца Рамадана.

### Большасць расіян лічаць Беларусь галоўным сябрам Расіі

Найбольш блізкімі сябрамі Расіі рэспандэнты лічаць Беларусь (46%) і Кітай (39%), хоць рэйтынгі гэтых краін знізіліся ў параўнанні з 2015 годам — з 55% і з 43% адпаведна, паведамляе Інтэрфакс са спасылкай на Левада-Цэнтр.

Таксама апытаныя заявілі аб сяброўскіх адносінах Расіі з Казахстанам (34%) і Сірыяй — яе назвалі саюзнікам Расіі 15% рэспандэнтаў. Таксама ў лік краін, дружалюбных Расійскай Федэрацыі, расіяне ўключылі Румынію (14%), Арменію (12%), Кубу (11%), Узбекістан, Таджыкістан і Азербайджан (па 9%).

Варожа настроенымі ў адносінах да Расіі краінамі рэспандэнты лічаць ЗША (69% супраць 73% у 2015-м), Украіну (50% супраць 37%), а таксама Германію (24% супраць 19%). Па 24% апытаных уключылі ў гэты спіс Латвію і Літву, 21% — Польшчу.

Найбольш радыкальна змянілася за апошнія два гады ўспрыманне расіянамі Турцыі: цяпер да «ворагаў» яе прылічаюць 8% апытаных, тады як год таму — 29%, а ў 2015 годзе — 1%.

### У зоне Бермудскага трохвугольніка зноў знік самалёт



Самалёт MU-2B вылецеў з Пуэрта-Рыка ў панядзелак у 11.00, на яго борце знаходзіліся чатыры чалавекі, у тым ліку двое дзяцей, паведамляюць РІА «Навіны». Праз тры гадзіны пасля вылету сувязь з ім знікла. Берагавая ахова ЗША паведаміла, што сувязь была страчана, калі самалёт знаходзіўся на вышыні 7 тыс. метраў над Эльютэрай — адным з Багамскіх астравоў. У раёне меркаванага крушэння паветранага судна праводзіцца пошукава-выратавальная аперацыя. Пазней стала вядома, што за 60 кіламетраў ад вострава Эльютэра былі знойдзены абломкі самалёта, зараз высвятляецца, ці належаць яны знікламу MU-2B. Гэты раён знаходзіцца ў так званым Бермудскім трохвугольніку, вакол якога ходзіць шмат легендаў, у прыватнасці пра тое, што тут бясследна знікаюць марскія і паветраныя судны.

# УЛАДА НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах.**

На гэтым тыдні прыёмы пройдуць у Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях па наступным графіку:

**7 чэрвеня 2017 г.**

**Герасімаў Васіль Мікалаевіч —** памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Брэсцкай вобласці — г. Белаазёрск (11.00—14.00)

**Крывашэеў Юрый Васільевіч —** начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта — Светлагорскі райвыканкам (11.00—14.00)

**8 чэрвеня 2017 г.**

**Бабіцкі Аляксей Уладзіміравіч —** намеснік начальніка ўпраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта — Чэрыкаўскі райвыканкам (11.00—14.00)

**9 чэрвеня 2017 г.**

**Ісачэнка Анатоль Міхайлавіч —** памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Мінскай вобласці — Любанскі райвыканкам (10.00—12.00)

Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

■ Еўрапейскі вектар

# Шырокія магчымасці ініцыятывы

**У лістападзе ў Мінску збяруцца прадстаўнікі 18 краін на пасяджэнне Парламенцкай асамблеі Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы.**

Сёлета Беларусь, як старшыня ЦЕІ, прапаноўвае выкарыстоўваць магчымасці і па-за межамі міжпарламенцкіх адносін. Савет Рэспублікі выбраў асноўны тэзіс — інтэлектуалізацыю эканомікі і кіравання. Гэта ідэя была адобрана партнёрамі. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ** паведаміў, што супрацоўніцтва ідзе не толькі паміж парламентамі, але і ў сферы навукі, адукацыі і тэхналогій. Гэта магчымасць закране ўвесь эканамічны блок на шматбаковай і двухбаковай аснове.

Па выніках пасяджэння Парламенцкага камітэта ЦЕІ можна адзначыць, што ў Беларусі атрымалася здзейсніць важны крок ва ўмацаванні еўрапейскага ўзаемадзеяння. Старшыня парламенцкай камісіі расказаў, што ёсць планы запрасіць бізнесменаў да нас, каб яны сфарміравалі прапановы, якія можна выкарыстоўваць на практыцы. Самая вялікая дэлегацыя на пасяджэнне прыехала з Італіі. Гэта краіна, якая хоча актыўна развіваць адносіны ва ўсходнім напрамку. Іх прыемна здзівіла інфраструктура Беларусі і якасць прадуктаў харчавання. Да таго ж такое супрацоўніцтва — магчымасць прыцягнуць замежныя інвестыцыі. Сяргей Рахманаў адзначыў, што неабходна выпрацаваць адзіную сістэму ўзаемадзеяння з партнёрамі, якая ўключае ўрадавы ўзровень, парламенцкае вымярэнне, канкрэтныя галіны вытворчасці і прыватны бізнес. Гэтыя напрамкі павінны быць добра скаардынаваны. Акрамя таго, патрэбна глыбокая аналітыка ў развіцці міжнародных адносін, каб кіраўнікі маглі выкарыстоўваць гэты інтэлектуальны патэнцыял.

Канкрэтныя напрамкі ўзаемадзеяння выпрацоўваюцца ў эканоміцы. Напрыклад, Венгрыя мае моцную банкаўскую сістэму, там створаны добрыя ўмовы для малога і сярэдняга бізнесу. «Гэты вопыт нам вельмі карысны, паколькі ідзе лібералізацыя эканомікі, — падкрэсліў Сяргей Рахманаў. — У нас рыхтуюць цэлы пакет дакументаў, які будзе рэалізаваны і датычыцца падтрымкі прадпрымальніцтва, у першую чаргу вытворчага. І досвед Венгрыі быў бы не лішнім. Калі нам удасца пашырыць узаемадзеянне ў банкаўскай і фінансавай сферах, гэта таксама будзе для нас вельмі карысным».

З Польшчай у Беларусі апошнім часам намецілася пазітыўная дынаміка па ўсіх напрамках. Абедзве краіны маюць агульны інтарэс у лагістыцы: з'яўляюцца сувязным звяном паміж Захадам і Усходам. Вялікія перспектывы адкрываюцца ў рамках развіцця эканамічнага пояса Шаўковага шляху. «Мы можам аб'яднаць намаганні, каб стварыць адпаведную вытворчую інфраструктуру, якая была б арыентавана на ўлік інтарэсаў Беларусі і Польшчы», — прапанаваў сенатар.

Сёлета чакаецца як мінімум яшчэ два буйныя мерапрыемствы ў рамках ЦЕІ. 22 чэрвеня ў Мінску пройдзе пасяджэнне міністраў замежных спраў дзяржаў ЦЕІ, а ўвосень — пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ. Чакаецца, што праграма пасяджэння будзе насычана не толькі дакладамі і афіцыйнымі мерапрыемствамі, але і візітамі на прадпрыемствы.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Меркаванне



# У чым праблемы Катара?

**5 чэрвеня сем дзяржаў — Бахрэйн, Саудаўская Аравія, Егіпет, ААЭ, Емен, Лівія і Мальдзівы — разарвалі дыпламатычныя адносіны з Катарам. Больш за тое, некаторыя з іх зрабілі жорсткія эканамічныя захады, якія сур'ёзна закрануць эканоміку невялікай дзяржавы. У прыватнасці, Бахрэйн, Саудаўская Аравія, Егіпет і ААЭ аб'явілі аб высылцы яго дыпламатаў і грамадзян і закрыцці для Катара марскіх партоў і паветранай прасторы.**

Катар — дастаткова незвычайная дзяржава. Яе насельніцтва ўсяго толькі 2,7 мільёна чалавек — менш, чым у беларускай суседкі Літвы, а тэрыторыя ўсяго толькі 11,5 тысячы квадратных кіламетраў. Звычайна дзяржавы з такімі параметрамі не могуць адыгрываць сур'ёзнай ролі ў міжнародных адносінах. Але ў Катара атрымліваецца. Уся справа ў сотнях мільярдаў долараў, назапашаных ад продажу нафты і газу, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны ў вялікай колькасці, і ўмелым выкарыстанні іх у знешнепалітычнай сферы. Катар уваходзіць у Савет супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва (ССАДПЗ) нароўні з такой буйной па мясцовых мерках краінай, як Саудаўская Аравія, насельніцтва якой у дзесяць разоў большае за катарскае, а даходы ад продажу энергарэсурсаў яшчэ больш значныя, але менавіта катарскія ўлады здагадаліся стварыць вельмі магутны сродак інфармацыі — тэлеканал Аль-Джазіра, моцная раскрутка якога ў сусветнай медыясферы зрабіла Катар уплывовым суб'ектам у сусветнай палітыцы.

Мяркуецца, што прычынай цяперашняга канфлікту стаў артыкул на сайце Катарскага агенцтва навін, у якім ад імя эміра краіны прапаноўвалісі дзеянні ў падтрымку наладжвання адносін з Іранам.

Пасля жорсткай адмоўнай рэакцыі з боку Саудаўскай Аравіі і іншых членаў ССАДПЗ афіцыйны прадстаўнік МЗС Катара зрабіў заяву, што словы эміра падроблены, бо сайт агенцтва ўзламаны хакерамі, якія размясцілі фальшыўку. Але партнёры Катара нібыта не паверылі ў абвяржэнне.

У выніку Катар спачатку быў выгнаны з ліку ўдзельнікаў аперацыі ў Емене, дзе робіцца спробы падавіць рух шыітаў хусітаў, якія, з пункту гледжання Саудаўскай Аравіі, маюць падтрымку з боку шыцкага Ірана ў процівагу суніцкаму афіцыйнаму кіраўніцтву. Цяпер дайшло і да разрыву дыпламатычных адносін і блакады. Афіцыйна прычынай падобных дзеянняў з'яўляюцца абвінавачанні ў тым, што Катар «практыкуе і ўмацоўвае тэрарызм» і падтрымлівае «Аль-Каіду» і «Ісламскую дзяржаву». Егіпет таксама абвінавачвае Катар у поўнамаштабнай падтрымцы забароненага ў краіне руху «Браты-мусульмане», супрацьстаянне з якім вельмі важнае для Каіра.

Але ці была падтрымка тэрарыстаў рэальнай прычынай такіх незвычайных рэзкіх дзеянняў, якія ўстрывожылі ўжо і ЗША (Дзяржсакратар ЗША Рэкс Цілерсан заклікаў бакі сесці за стол перагавораў, нагадваючы на важнасці для ЗША адзінства ў ССАДПЗ). У гэта верыцца слаба. Па гэтым аспекце практычна ўсе члены ССАДПЗ не тое што не без граху, а моцна замазаны. Дастаткова ўспомніць, што ў знакамітай тэрарыстычнай атацы на ЗША 11 верасня 2001 года з дзевятнаццаці ўдзельнікаўтэрарыстаў большасць былі грамадзянамі Саудаўскай Аравіі. Не з'яўляецца тайнай і тое, што падчас сумных падзей у 1990-х гадах на тэрыторыі Расіі ў Чачні мясцовыя тэрарысты атрымлівалі шчодрае фінансаванне практычна ад усіх краін ССАДПЗ, і Катар у гэтых адносінах не быў нейкім выключэннем. Практычна ўсе члены ССАДПЗ прафінансавалі і тых, хто рабіў рэвалюцыі ў Егіпце, Лівіі, Тунісе і Сірыі. Дабрачынныя фонды, якія па факце фінансава падтрымліваюць дастаткова сумнеўныя колы, блізкія да «Ісламскай дзяржавы» і Аль-Каіды, ёсць на тэрыторыі ўсіх гэтых дзяржаў.

Пад сумненнем таксама, што такія дзеянні робіцца з-за падтрымкі Катарам Ірана. Суніты ў Катары цалкам дамінуюць, што робіць малаверагодным такі кірунак катарскай палітыкі. Тым больш што сама прысутнасць катарскіх войскаў у еменскай аперацыі, якая рэалізуецца супраць інтарэсаў Ірана, гаварыла сама за сябе аб адносінах Катара да Ірана.

З разумных тлумачэнняў можна знайсці толькі два магчымыя. І абодва звязаны з барацьбой за ўладу.

Першы варыянт — Катар паспрабаваў рэалізаваць тайную змову па змене ўлады ў адной з ключавых дзяржаў рэгіёна. Змова правалілася, а абураныя суседзі цяпер помсцяць.

Другі варыянт — хтосьці з суседзяў спрабуе пры падтрымцы сваіх саюзнікаў наладзіць унутраны пераварот у самім Катары, каб атрымаць кантроль над сотнямі мільярдаў долараў збержэння і багатымі прыроднымі рэсурсамі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■

# ПАД ЗНАКАМ СКАРЫНЫ

## Масква падключылася да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання

**Учора ў Дзелавым і культурным комплексе пасольства Беларусі ў Расіі адбыўся круглы стол «Дыпламатыя слова: 500-годдзе беларускага кнігадрукавання ў кантэксце сусветнай культуры».**

**Міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ** адзначыла, што мерапрыемства прымеркавана да ўдзелу беларускіх кнігавыдаўцоў у маскоўскім кніжным фестывалі «Красная площа». «Тое, што ў цэнтры расійскай сталіцы, каля Крамля, прадстаўлена беларуская кніга, — сімвалічны, важны і добры знак, — сказала яна. — Вынікам удзелу павінна стаць далейшае пашырэнне, умацаванне гуманітарнай прасторы Беларусі».

Спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой звярнуў увагу на неабходнасць больш шырока прапагандаваць беларускую літаратуру і яе славутых класікаў як у Расіі, так і ў краінах СНД. Ён прапанаваў больш актыўна стымуляваць пераклады беларускай літаратуры, спрыяць наладжванню супрацоўніцтва паміж выдаўцамі і кнігараспаўсюджвальнікамі Беларусі, Расіі і іншых краін СНД.

Цэлы шэраг канструктыўных ідэй па супрацоўніцтве агучылі першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наш современник» Аляксандр Казінцаў, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў




Беларусі Алена Стэльмах, загадчык аддзела міжнародных сувязяў Інстытута сусветнай літаратуры Расійскай акадэміі навук Казбек Султанаў, старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі Сяргей Кандыбовіч, шэф-рэдактар газеты «Союз. Беларусь-Россия» Вольга Герасіменка, намеснік начальніка ўпраўлення перыядычнага друку Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях Расіі Генадзь Кудзій.

Лілія Ананіч нагадала, што 2017 год праходзіць пад знакам Францыска Скарыны: сёлета адзначаецца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Першая кніга, выдадзеная на беларускай мове 6 жніўня 1517 года, — «Псалтыр» Францыска Скарыны. Гэтая дата і лічыцца пачаткам беларускага кнігадрукавання.

За круглым сталом міністр расказала, як у Беларусі шануюць памяць першадрукара. А міжнароднае прызнанне яго спадчыны пацверджана рашэннем ЮНЕСКА: 500-гадовы юбілей беларускага кнігадрукавання ўключаны ў каляндар памятных дат.

«У дзейнасці вялікага гуманіста ярка адбіліся асветніцкія і дэмакратычныя тэндэнцыі эпохі Адраджэння, культурныя сувязі з замежжам, — сказала Лілія Ананіч. — Прэзентацыі кніг, прысвечаных Скарыну, шырока праходзяць сёлета і за мяжой: у Літве, Чэхіі, Польшчы, Расіі, Кітаі, Сербіі, іншых краінах. І сёння кніга, супрацоўніцтва літаратараў з'яўляюцца найважнейшым гуманітарным мостам сяброўства».

За круглым сталом адбылася зацікаўленая размова пра ролю літаратуры ў захаванні ўзаемаразумення і братняга суіснавання народаў СНД, традыцыях дружбы пісьменнікаў на постсавецкай прасторы, удасканаленні механізмаў супрацоўніцтва ў галіне культуры, развіцці беларускага кнігадрукавання ў кантэксце сусветнай гісторыі. Гаварылі таксама аб перакладзе твораў Францыска Скарыны на мовы дзяржаў Садружнасці, захаванні яго спадчыны.

Падрабязна пра работу пасольства Беларусі ў Расіі па папулярызацыі беларускай літаратуры і мастацтва распавяла саветнік дыппрадстаўніцтва Наталля Вашчыла. Яна паведаміла, што ў верасні на пляцоўцы Дзелавога і культурнага комплексу пасольства пройдуць мерапрыемствы, прысвечаныя Францыску Скарыну: выстаўка «Кніжная спадчына Скарыны» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прэм'ерны спектакль «Скарына» Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

Мадэратар мерапрыемства намеснік міністра інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч, падводзячы яго вынікі, адзначыў, што праведзеная размова, сустрэчы літаратараў Беларусі і Расіі, а таксама іншых краін Садружнасці знойдуць свой працяг у новых выдавецкіх праектах, перакладах, якія ўзбагачаюць нацыянальныя літаратуры.

Арганізатарамі круглага стала выступілі Міністэрства інфармацыі Беларусі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы пасольства Беларусі ў Расіі.

**Кар. «Звязды».**

■ Надвор'е

# Цёпла, дажджы і навальніцы

**Бягучы тыдзень у Беларусі абяцае быць цёплым, у тым ліку і ў начныя гадзіны, але дажджлівым. Найбольш ападкаў прагназуецца ў сераду, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыяцыйнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння, у аўторак, надвор'е вызначаецца зонай павышанага атмасфернага ціску. Будзе цёпла, ноччу і ранкам у асобных раёнах слабы туман. Уначы слупок тэрмометра падымецца да 7—13 градусаў, удзень — да 20—25, а па поўдні краіны і да 27.

У сераду на тэрыторыю краіны прыйдуць атмасферныя франты і няўстойлівыя паветраныя масы з Балтыйскага мора. Сіноптыкі прадказваюць вільготнае надвор'е: ноччу па паўднёвым захадзе, а ўдзень па большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература ўначы ад 8 градусаў па паўночным усходзе да +17 па паўднёвым захадзе краіны, удзень 17—24, а па паўднёвым усходзе да +29.

У чацвер няўстойлівы характар надвор'я захаваецца. На паўночным усходзе Беларусі ўмовы будзе дыктаваць той самы атмасферны фронт, таму там зноў не абыдзецца без дажджоў, залеў і навальніц. Днём у краіну зноў прыйдуць паветраныя масы з Балтыкі, што таксама выкліча кароткачасовыя дажджы ў асобных раёнах. Тэмпература ўначы чакаецца на ўзроўні 8—15 градусаў, удзень — ад 17 да 24.

У пятніцу ноччу па поўначы, а днём па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 8—15 градусаў, удзень — 16—21. На паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да 25 градусаў. Па папярэдніх прагнозах, у выхадныя надвор'е застанецца падобным — па большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, існуе высокая імавернасць навальніц. Начная тэмпература будзе складаць ад 8 да 16 градусаў, дзённая — 16—25.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■

# У ГОСЦІ ДА БАЛОТНІКА

**У Бярэзінскім біясферным запаведніку па ініцыятыве грамадскай арганізацыі «Адпачынак ў вёсцы» ствараецца цэнтр міфалагічнага турызму. Вобразы незвычайных істот будуць выкарыстоўвацца для таго, каб расказваць пра прыроду і вучыць людзей беражліва да яе ставіцца.**

Напрыканцы чэрвеня плануецца адкрыць тут музей, які будзе знаёміць з беларускай міфалогіяй, а адпаведная экалагічная сцежка ўжо пачала працаваць. У час падарожжа па ёй вы сустрэнецеся з Пушчавікам, русалкамі, асілкам, Кладнікам, Аржавенем, змяіным царом і іншымі незвычайнымі істотамі. Усяго было зроблена 17 інсталяцый, і чаравалі над імі беларускія дызайнеры і скульптары. Супрацоўнікі запаведніка прапануюць гасцям і начныя экскурсіі па чароўнай сцежцы з ліхтарыкамі. Тут сапраўды можна атрымаць незабыўныя ўражанні, бо пры стварэнні кампазіцый былі задзейнічаны шкло і люстэркі, якія ў цемры ствараюць розныя водбліскі. Дарэчы, перад пачаткам падарожжа гасцям прапануюць прачытаць аўтэнтычную замову на шчаслівую дарогу, прычым нават замежнікі вымаўляюць яе па-беларуску. А напрыканцы гасцям давядзецца паблукаць па драўляным лабірынце.

Плануецца, што ў час экскурсій будзе задзейнічана анімацыя. У штаце запаведніка ёсць свой «Балотнік» — вопытны экскурсавод. Акрамя таго, была праведзена школа аніматараў сярод мясцовых школьнікаў, і дзеці з задавальненнем дапамагалі праводзіць экскурсіі, а таксама пісалі сачыненні і рабілі малюнкі, прысвечаныя мясцовым легендам і паданням. Між іншым, у першую чаргу ў запаведніку плануюць знаёміць з міфамі свайго рэгіёна. Думалі тут і над тым, якія сувеніры можна было б вырабляць для турыстаў. Так, адной з прапаноў на праведзеных тут занятках у школе рамесніцкай стала фігурка вужовага караля.

Актыўна вядуцца работы па перайтварэнні былога лясніцтва ў міфалагічны музей. Аўтары праекта кансультаваліся з навукоўцамі аб тым, чым варта яго аздобіць. Тут вы не ўбачыце візуальных вобразаў, будуць выкарыстаны гукавыя, светавыя інсталяцыі. Пра беларускія традыцыі нагадваюць прадметы, размешчаныя ў пакоях. Напрыклад, пра зімовыя свядчаць калядныя маскі, дуда; вясновыя — галёпы, фігуркі птушак; лета — гэта, безумоўна, вянчок і грэбень (якім бяццам расчэсвалі доўгія валасы русалкі)...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■ Аты-баты

# БОЛЬШ МОЦЫ І ДАКЛАДНАСЦІ







**На 174-м вучэбным палігоне ВПС і войскаў ППА днямі адбылася ўрачыстая перадача асабістаму складу 969-й базы рэзерву танкаў новай партыі мадэрнізаваных машын Т-72Б3.**

Новая мадэль абсталявана больш магутным рухавіком і палепшана комплексам узбраення, які гарантуе высокую верагоднасць знішчэння цэлі з месца і ў руху на адлегласці да пяці кіламетраў. Таксама машыну абсталявалі новымі датчыкамі, бартавымі экранамі корпуса са здымнай модульнай абаронай. Змены закранулі і прыцэл, які замянілі на «Сасна-У» беларускай вытворчасці.

Падчас перадачы тэхнікі **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ** адзначыў, што гэта не першы крок мадэрнізацыі ўзбраення. «Мы рухаемся ў двух напрамках: мадэрнізуем і рамантуем танкі на сваіх заводах і ідзём па шляху ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва з Расіяй. Яны нам праводзяць рамонт і мадэрнізацыю тэхнікі па ўнутрырасійскіх цэнах — гэта адпавядае ўмовам дагавора аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве», — заявіў міністр.

На мерапрыемстве прысутнічала расійская дэлегацыя ад навукова-вытворчай карпарацыі «Уралвагонзавод», які займаўся мадэрнізацыяй. Па заканчэнні мерапрыемства быў падпісаны чарговы кантракт на мадэрнізацыю танкаў Т-72Б расійскім партнёрам.

Удзельнікам урачыстай перадачы танкаў быў прадэманстраваны элемент танкавага біятлона. Сёлета ў міжнародных штогадовых спаборніцтвах па гэтым відзе армейскага спорту возьме ўдзел і мадэрнізаваны Т-72Б3.

**Сяргей НІКАНОВІЧ,**
**фота аўтара**

■ Літаратурныя сувязі

# Нашы кнігі на Краснай плошчы

**У Маскве праходзіць кніжны фестываль «Красная плошча». Вялікім стэндам прадстаўлена і прадукцыя беларускіх кніжнікаў.**




Каля стэнда нашых кнігавыдаўцоў і кнігагандляроў мнагалюдна: гасцей, наведвальнікаў фэсту цікавіць літаральна ўсё — кнігі па гісторыі Беларусі, беларускія падручнікі, нават буквары.

У аднаго з наведвальнікаў, які асабліва ўважліва разглядае кнігі, пытаюся, што прывяло на фестываль, што ён шукае сярод іншых кніг. І вось што пачуў у адказ:

— Мяне цікавяць беларускія класікі. Сам я нарадзіўся ў Маскве. Хоць і маці, і бацька — з Беларусі. Тут, у сталіцы Савецкага Саюза, вучыліся, тут засталіся працаваць, зрабілі кар'еру. А дома ў нас заўсёды ведалі Купалу, Коласа, Куляшова ... Чыталі Шамякіна і Быкава. А я вось зараз хачу нешта прынесці беларускае сваім дзецям — можа быць, адшукаю і новага цікавага пісьменніка...

Фестываль «Красная плошча» носіць на дзіва практычны характар: наведвальнікі вяртаюцца з выставы з пакетамі кніжных навінак. А я знаходжу сярод кніг расійскіх выдавецтваў і тыя выданні, якія так ці інакш звязаныя з Беларуссю. Вось і навінкі серыі «ЖЗЛ» — кнігі С. Рыбаса «Грамыка» і Н. Далгаполава «Надзея Траян». На стэндзе выдавецтва «Время» — кнігі добра вядомых мінскіх дзіцячых пісьменнікаў Яўгеніі Пастэрнак і Андрэя Жвалеўскага. У тым ліку — і іх выдатная аповесць «Гімназія №13», якая, дарэчы, у перакладзе на беларускую была апублікавана і ў часопісе «Маладосць».

Каля беларускага стэнда сустракаю **старшыню ФНКА «Беларусы Расіі» Сяргея КАНДЫБОВІЧА.**

— Уважліва паглядзеў навінкі, прысвечаныя Скарыну, 500-годдзю беларускага кнігавыдання. Абавязкова нешта куплю, — сказаў ён. — Якіх кніг асабіста я чакаю ад беларускіх выдавецтваў? Вядома ж, кніг па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Набліжаецца 75-годдзе Вялікай Перамогі, якое, не сумняваюся, вельмі годна краіны Садружнасці Незалежных Дзяржаў будуць адзначаць у 2020 годзе. Агульная для беларусаў і расіян тэма павінна быць адлюстравана ў кнігах. Хацелася б убачыць выданні пра кіраўнікоў партызанскага руху, пра тых, без каго не было б сённяшняга мірнага неба. Мне здаецца, што пяра гісторыкаў, публіцыстаў і нават празаікаў вартыя такія гістарычныя персанажы, як Панамарэнка, Мазураў, Машэраў, Зімянін...

**Сяргей ШЫЧКО,**

*Масква*

# Месца сустрэчы талентаў

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Гэты фестываль сапраўды знакавы. З вялікай сцэны летняга амфітэатра гучаць песні на роднай мове. Іх выконваюць найлепшыя артысты нашай краіны. Яркія касцюмы, адметнае светлавое афармленне — прыемна, што ў нацыянальнай песні такое годнае суправаджэнне. Якое б ні было надвор'е — ці праліўны дождж, ці пранізлівы холад, як сёлета, — гледачы заўсёды з заміраннем сэрца сочаць за тым, што адбываецца на сцэне. Родная песня пранікае ў самыя патаемныя куткі душы.

## Любімы, але... такі ж самы?

Аднак у тых, хто наведвае фестываль кожны год, часам складваецца ўражанне, што ўсё гэта мы ўжо дзесьці бачылі. Вядома, эстрадных песень пабеларуску зашмат быць не можа. Але аднымі і тымі ж застаюцца падыходы ў падачы твораў, у самой канцэпцыі свята.

Вось што думае пра гэта **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ:**

— На мой погляд, сёлетняя праграма фестывалю вельмі цікавая. Як заўсёды, яна разлічана на два дні, але на трэці дзень адбываецца працяг свята. Мы адкрываем фестываль урачыстым канцэртам. Адначасова гэта і падвядзенне вынікаў конкурсу маладых выканаўцаў... Раней фестываль праходзіў радзей, раз на два гады. Для такога свята трэба, каб саспелі таленты, каб арганізатары падрыхтавалі адметную праграму, якая з'яўляецца вынікам супрацы паэтаў і кампазітараў, — ім таксама патрэбен час, каб нараджаліся новыя творы. Але пакуль што фестываль застаецца штогадовым. Я згодны, што трэба шукаць новыя формы яго правядзення. На мой погляд, варта кожны год запрашаць новых рэжысёраў, якія прапаноўвалі б сваю канцэпцыю. Можа быць, з наступнага года мы пачнём гэта рабіць на конкурснай аснове, як і на іншых значных фестывалях. Тады з'явіцца канкурэнцыя і розныя бачанні гэтага фэсту.

## Шчаслівы білет на эстраду

Традыцыйна ў першы фестывальны дзень праходзіць Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні. Маладыя людзі з розных куткоў краіны спаборнічаюць у вакальным майстэрстве, дэманструючы па дзве песні на беларускай мове.

Пасля абвяшчэння вынікаў за кулісамі летняга амфітэатра хтосьці не мог схаваць шчаслівых эмоцый, бо атрымаў высокую ўзнагароду. Іншыя былі крыху засмучанымі, што не ўдалося заняць свайго месца на вакальным Алімпе Маладзечна. Але конкурс ёсць конкурс, камусьці выпадае шчаслівы білет, а камусьці не. Галоўнае, наколькі працаздольным і мэтанакіраваным у далейшым будзе малады артыст.

— Наладжана вельмі добрая сістэма, як адшукаць таленты, як іх адукоўваць і як пазней ім дапамагаць — праз фонд Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Звесткі пра ўсіх маладых артыстаў захоўваюцца, таму не праблема іх знайсці і адсачыць, як складваецца творчы лёс. Натуральна, не ўсе робяцца прафесійнымі выканаўцамі ў тым ці іншым жанры. Але самым лепшым мы дапамагаем, — адзначыў Барыс Святлоў.

Абсалютным пераможцам конкурсу маладых выканаўцаў сёлета стала Вольга Булай, прадстаўніца Мінскай вобласці. Ёй удалося заваяваць адразу дзве ўзнагароды — Гран-пры, а таксама спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна. Першае месца прысудзілі Ганне Трубяцкой з Магілёўскай вобласці. Другое — у Аляксея Грыневіча з Мінскай вобласці. Трэцяе месца падзялілі паміж сабой Аляксандр Малашэнка з Магілёўскай вобласці і Міла Урбановіч з Гомельскай.



— Усе канкурсанты былі надзвычай моцныя, таму перамога для мяне стала поўнай нечаканасцю, — расказала карэспандэнту «Звязды» **Вольга БУЛАЙ.** — Я выканала песні «Трымай мяне» на музыку Святаслава Пазняка і словы Ірыны Багданавай і «Зязюлю» на музыку Мікалая Някрасава, тэкст на беларускую мову я пераклала сама. Дарэчы, мая любімая паэтка — гэта Таццяна Мушынская. У яе надзвычай тонкія і лірычныя вершы.

Падчас вячэрняга канцэрта «Купала і Колас. Вы нас гадавалі» сярод іншых знакавых артыстаў было ўцешна ўбачыць Валерыю Грыбусаву. Пару гадоў таму яна атрымала Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў, а цяпер ужо спявае разам з аркестрам пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Выкананне Грыбусавай было адным з самых яскравых і запамінальных як на конкурсе, так і ў гэтыя фестывальныя дні.

## «Месяц лампаду запаліць»

Паэтычная гасцёўня «Красуй, Беларусь» праходзіла ў малой зале Палаца культуры Маладзечна. Ужо традыцыйна ў ёй прымалі ўдзел члены Саюза пісьменнікаў Беларусі — большасць з іх можна было ўбачыць у Маладзечне і ў мінулыя гады. Гэта Міхась Башлакоў, Уладзімір Мазго, Міхась Пазнякоў, Мікола Шабовіч, Іна Фралова. Сёлета праграма дапоўнілася выступамі яскравых бардаў — Ганны Чумаковай і Андрэя Зыгмантовіча. Адна з песень апошняга, «Месяц лампаду запаліць», напісана на верш Навума Гальпяровіча, які вёў рэй на паэтычнай імпрэзе. Яго сувядучай, як і ў мінулыя гады, была Таццяна Сівец. Напрыканцы яна прачытала ўласныя, вельмі пранікнёныя, вершы.

Падаецца, гэту праграму таксама можна было б ажывіць — новымі імёнамі, нечаканымі сцэнарнымі падыходамі і, напрыклад, уласным конкурсам.

* * *

Канцэрты першага фестывальнага дня праходзілі ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Яскравы жывы гук з'яўляецца яшчэ адной нязменнай адметнасцю і перавагай фестывалю.

Дарэчы, на адным з фэстаў у Маладзечне музычнае суправаджэнне забяспечваў сімфанічны аркестр Маладзечанскага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага пад кіраўніцтвам Рыгора Сарокі, які таксама мае вельмі высокі ўзровень выканання. Можа, варта было б даць больш магчымасцяў мясцовым музыкам, каб прадэманстравалі сваё майстэрства?..

Канцэрт-закрыццё быў прысвечаны 45-гадоваму юбілею ансамбля «Сябры». Яго мастацкаму кіраўніку, салісту Анатолю Ярмоленку ўдалося прадставіць надзвычай насычаную праграму. Разам з ім на сцэну выходзілі Руслан Аляхно, Вікторыя Алешка, іншыя артысты. Гучалі не толькі любімыя многімі шлягеры, але і новыя песні. Ці стануць яны хітамі, пакажа час.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

*Маладзечанскі р-н.*

■ На сваe вочы

# «Я ПРАЕХАЎ АЎТАСТОПАМ КАЛЯ 120 ТЫСЯЧ КІЛАМЕТРАЎ»

**Бабруйскі падарожнік Андрэй Снігур нядаўна дабраўся гэтым спосабам аж но да Кітая. Узяўшы з сабой у дарогу сумку з рэчамі і 27 долараў, ён пераадолеў больш за 5 тысяч кіламетраў усяго за 4 дні і 22 гадзіны. Падарожнік адправіўся па маршруце Мінск—Масква—Уладзімір—Ніжні Ноўгарад—Чэбаксары—Казань—Набярэжныя Чаўны—Уфа—Чэлябінск—Троіцк—Кустанай—Астана—Караганда—Алматы—Жаркент—мяжа з Кітаем.**



З Андрэем Снігуром мы гутарым па скайпе. У мікрафон залятае адрывістая кітайская гаворка. Недзе на заднім фоне грукочуць грузавікі. Сувязь ненадзейная, гук перыядычна выключаецца. Але зважаючы на велізарную адлегласць, гэта і не здаецца вялікай праблемай.

***— Як у вас нарадзілася задума такога транскантынентальнага падарожжа?***

— Насамрэч я еду ў краіны Паўднёва-Усходняй Азіі ўжо трэці раз. Тры гады таму шлях у Кітай заняў у мяне 5 месяцаў. Праўда, тады я наведаў заадно і іншыя азіяцкія краіны.

***— Чым прыцягвае ўвагу менавіта Кітай?***

— Гэтая краіна мне падабалася яшчэ ў дзяцінстве. Усё пачалося з фільмаў з Джэкі Чанам і Брусам Лі. Цяпер жа я запусціў свой праект — Bulba Channel, для якога і хачу здымаць відэа пра падарожжы. Скажам, нешта накшталт «гонзажурналістыкі» для фармату Youtube. Натуральна, гэта працэй рабіць у краіне, дзе ты ўжо быў і калі штосьці ведаеш. Таму першай краінай у маім турнэ аказаўся Кітай.

***— Як шмат часу займае падрыхтоўка да падарожжа аўтастопам?***

— Усё проста — я зрабіў візу, сабраў сумку і паехаў.

***— У многіх людзей падарожжа аўтастопам звязана з боязззю...***

— Я праехаў такім спосабам ужо каля 120 тысяч кіламетраў. Лічыце, тройчы аб'ехаў зямны шар па экватары. Мяне падвозіла агулам недзе каля 3 тысяч чалавек. І з іх усіх толькі адзін аказаўся нядобрым. Усе астатнія кіроўцы ў рознай ступені былі адкрытыя, сяброўскія. Зла я ад іх не бачыў. Але пагаджуся, што гісторый аб тым, што падарожнікі-аўтастопшчыкі знікаюць, — вельмі шмат. Мушу зазначыць, што небяспека тут ёсць і з боку кіроўцы, і з боку аўтастопшчыка. Нават можна сказаць, што паміж імі ўзнікае ўзаемная боязь. Але проста абодвум бакам трэба паводзіць сябе адэкватна. І гэта мала таго што панізіць градус недаверу, дык яшчэ і вырашыць многія пытанні.

***— Андрэй, а чаму быў абраны шлях з такой вялікай колькасцю пераваланых пунктаў?***

— Насамрэч іх не так і шмат. Справа ў тым, што гэта быў самы кароткі і хуткі маршрут. Я наўмысна выбіраў аўтамабілі, якія абміналі гарады. У вялікія населеныя пункты я заязджаю ў рэдкіх выпадках. Таму што пытанне, як у іншай краіне дабрацца, скажам, з горада А ў горад Б, вельмі вострае. Ты не ведаеш ні вулічна-дарожнай сеткі, ні маршрутаў грамадскага транспарту. Ды і самі гарады могуць вельмі адрозніваццa ад беларускіх па сваіх памерах. Я аднойчы трапіў у горад Ланьчжоў, сталіцу правінцыі Ганьсу ў Цэнтральным Кітаі. (Там жыве больш за 3 мільёны чалавек, але ж і плошча гарадской акругі велізарная — больш за 13 тысяч квадратных кіламетраў! — **Аўт.**) Дык я адтуль выбіраўся паўдня. А трасы я ведаў, бо ездзіў па іх раней.

***— Вядома, што ў Кітаі горад-мільённік мае статус чагосьці звычайнага — як у нас, скажам, райцэнтр з насельніцтвам у 15 ці 20 тысяч чалавек. Але наколькі адрозніваюцца беларускія гарады ад кітайскіх па планіроўцы?***

— Вось я так і не магу зразумець, адкуль узяўся гэты стэрэатып. Інжынеры і архітэктары будуюць і плануюць гарады па адным і тым жа прынцыпе. Што ў нас, што ў Кітаі. У цэнтры гарадоў стаяць дамы раскошныя, сярод іх шмат высотак. Бліжэй да ўскраін пачынаюцца трушчобы. І відавочных трушчоб у цэнтры я не сустракаў.

***— Што вас больш за ўсё здзіўляе падчас паездак?***

— Заўжды радуюць людзі, якіх мне падкідвае лёс. Калі жывеш проста, то неяк зачыняешся ў сваім мікракосме і пяць дзён на тыдзень крэйсіруеш па маршруце домпраца-дом. І ў рэшце рэшт прыходзіць усведамленне, што вялікі свет недзе там за гарызонтам, а я знаходжуся толькі тут. Падчас аўтастопу ж пастаянна сутыкаешся з іншым светам, з іншымі людзьмі. Напэўна, будзе залішне казаць пра ментальныя адрозненні паміж кітайцамі і беларусамі. І гэта мне вельмі цікава.

***— Па Кітаі вы перасоўваліся на мясцовых фурах. А як жа моўны бар'ер? Няўжо шмат кітайцаў ведаюць англійскую мову?***

— Сярод кітайскіх дальнабойшчыкаў, на жаль, вельмі мала тых, з кім можна пагутарыць па-англійску. З рускай мовай таксама там не вельмі. Але праблема вырашальная, калі вы гулялі ў дзяцінстве ў гульню «кракадзіл». Калі машына спынілася, то дастаткова паказаць, што вы едзеце прама і без грошай. І просіце знакамі падвезці хоць кудысьці, пакуль не збочыце з трасы. У асноўным кітайцы гэтую сістэму разумеюць. І калі аўтамабіль спыніўся, то, як правіла, кіроўца вас возьме на борт.

***— Вы ўзялі з сабой 27 долараў. На што вы іх патрацілі?***

— Агулам я выдаткаваў 20 долараў. Я іх патраціў на тое, каб перакусіць у прыдарожных кафэ, некалькі разоў папіў гарбату, і даваліся заплаціць за грамадскі транспарт, каб выбрацца з горада. Напрыклад, Алматы — горад па планіроўцы даволі складаны, выбрацца адтуль цяжка. Адтуль я выехаў на таксі за 3 долары. Частку грошай я адклаў на тое, каб перасекчы казахска-кітайскую мяжу. Справа ў тым, што там пешага пераходу няма. І ў Паднябесную можна трапіць толькі на маршрутцы. Але кіроўца мікрааўтобуса з мяне грошай не ўзяў. Ён спытаў: «Ты гоп-стопам едзеш?» Я зразумеў, што ён хоча сказаць, і адказаў: «Так, аўтастопам». Кошт маршруткі быў 3 тысячы тэнге — гэта каля 10 долараў. Вось так я і трапіў у Кітай. Адметна, што пры перасячэнні любой мяжы бачна, што ты ў іншай краіне. Беларусь і Расія адрозніваюцца станам палёў, дарог, шыльдамі і аўтамабілямі, якія едуць па трасе. Паміж Расіяй і Казахстанам кантраст узмацняецца, а апошні вельмі рэзка адрозніваецца ад Кітая ўжо на першых хвілінах язды. Кітай — магутная краіна з выдатнымі трасамі, гмахамі, якія пастаянна будуюцца, чыстымі і шырокімі вуліцамі, якія пастаянна добраўпарадкоўваюцца. І гэта вельмі моцна кідаецца ў вочы.

***— Андрэй, а назад у Мінск вы таксама паедзеце аўтастопам?***

— Буду глядзець па сваім матэрыяльным стане. Вяртацца я буду ў лістападзе. Справа ў тым, што я зараз вучуся ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце на 3-м курсе, і ў гэты час мне трэба будзе здаваць сесію. Ды і па Казахстане, і па Расіі ехаць у халодную пару года няручна — у іх зіма наступае раней, чым у нас. Выязджаць планую з Паўднёвай Карэі, у якой яшчэ не быў. У планах таксама правесці два месяцы ў Кітаі, паўмесяца ў В'етнаме, тыдзень у Лаосе, месяц у Тайландзе, каля месяца ў Малайзіі. Хачу таксама трапіць у маладасяжныя Тыбет і КНДР.

***— З якімі цяжкасцямі сутыкнуліся падчас паездкі?***

— Я выязджаў 11 мая з Мінска ў Маскву. У гэты час валіў добры мокры снег. А я разлічваў, што будзе сонечна і цёпла. Але хачу сказаць, што да мяжы з Кітаем я дабраўся нават крыху хутчэй — за 4 дні і 10 гадзін. Вось толькі атрымалася няўдача: апошняя маршрутка з Казахстана сышла літаральна за пяць хвілін да таго, як я туды пад'ехаў. І ўсё — памежны пераход закрываецца да наступнага дня. Мне трэба было недзе пераначаваць. Думаў ставіць палатку, але знайшоў прытулак у мясцовага жыхара ў вёсцы непадалёк. Вось гэта і была самая вялікая цяжкасць.

***— А што параіце па ўласным досведзе тым, хто хоча падарожнічаць аўтастопам?***

— Бярыце з сабой другога чалавека. Паездка будзе крыху павольнейшай па часе, але значна весялейшай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Год навукі

# САМЫ ЦЯЖКІ Ў СВЕЦЕ МАЯТНІК ФУКО

## цяпер знаходзіцца ў гомельскай сярэдняй школе №69

**Менавіта так сцвярджаюць ініцыятары ўсталявання прыбора, які на працягу апошніх 166 гадоў навукова даказвае, што Зямля рухаецца вакол сваёй восі. Аказваецца, кожную секунду мы пралятаем у космасе каля 300 метраў менавіта па прычыне кручэння планеты. У 1851 годзе, калі маятнік упершыню прадэманстраваў французскі фізік Жан Бернар Леон Фуко, гэта стала канкрэтным навуковым доказам, а цяпер маятнік з'яўляецца яшчэ і своеасаблівым сімвалам вечнага імкнення чалавецтва да ведаў.**

Металічны шар Леон Фуко падвесіў пад купалам Пантэона. Ён важыў 28 кг і быў замацаваны на стальным дроце даўжынёй 67 метраў. Заўважце: гомельскі шар выраблены са сталі і важыць 60 кг. Дрот, на якім ён рухаецца, мае даўжыню 12,5 метра і замацаваны ў атрыуме школы з фізіка-матэматычным ухілам. Тут школьнікам пашанцавала з будынкам. Яго ўнікальны праект дае магчымасць пры ўваходзе пад самай столяй надзейна замацаваць трос, на якім і вагаецца шар.

У сучасных маятніках Фуко выкарыстоўваюць электрамагнітную сістэму, якая іх падштурхоўвае і дазваляе назіраць эфект кручэння Зямлі кругласутачна. Такую — са святлодыёднай індыкацыяй — мае і гомельскі.

— Маятнік захоўвае плоскасць сваіх ваганняў, а Зямля круціцца, таму ссоўваецца стрэлка, — тлумачыць механізм работы **кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Віктар БРЭЛЬ.** — Хвілін праз 15 мы пабачым невялікі паварот гэтага маятніка. Нам здаецца, што паварочваецца маятнік, насамрэч паварочваецца Зямля пад ім.

Усе разлікі выканала прафесарска-выкладчыцкая група Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога. Дапамогу аказалі хімічны завод, канструктарскае бюро сістэмнага праграмавання, «Цэнтраліт» і індывідуальны прадпрымальнік, былы выпускнік 69-й школы.

Маятнік Фуко — не проста вядомы дэманстрацыйны прыбор, але і ўвогуле новыя магчымасці ў сістэме адукацыі Гомельшчыны, сцвярджаюць ініцыятары праекта. Сярод іх — **кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ.** Ён падкрэсліў на адкрыцці, што нестандартны падыход трэба абавязкова распаўсюдзіць на іншыя ўстановы адукацыі, каб і яны мелі сваю адметнасць:

— Важна, каб працэс атрымання ведаў станавіўся для вучняў па-сапраўднаму цікавым.

Адкрыты ў Год навукі маятнік — першы ўсталяваны ў звычайнай школе. Дарэчы, усяго ў свеце каля 30 маятнікаў Фуко. Вядома, што з 1961 да 1988 года ў Гомельскім планетарыі, размешчаным у той час у будынку сабора Пятра і Паўла, знаходзіўся аналагічны. Там праводзіліся лекцыі па фізіцы, астраноміі, касманаўтыцы. **Дырэктар школы №69 Аляксандр МАШКАРАЎ** гаворыць, што ад ідэі праекта да яго ўвасаблення прайшло 10 гадоў:

— Гэта не радавы дапаможнік. У краінах СНД зусім няшмат дзейных маятнікаў Фуко, а ў краіне да нашага іх было ўсяго два. Адзін — у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка і другі — у капліцы мемарыяльнага комплексу «Буйніцкае поле». Наш маятнік — гэта толькі частка агульнага праекта. Ужо ўсталяваны вялізны экран, спецыяльныя гукавая і праекцыйная сістэмы. З дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій у трохмерным вымярэнні цяпер можна будзе наглядзець за космасам. Выкарыстоўвацца ўся сістэма будзе пры вывучэнні не толькі фізікі і астраноміі, але і геаграфіі і іншых дысцыплін.



Маятнік запускаюць дацэнт Віктар БРЭЛЬ і вучань школы №69 Ігар КОЛАСАЎ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев» на первых торгах 7 июля 2017 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости:

Конт. тел.: 8-029-6332490 vel.; (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124. E-mail: mischuk_am@mail/

Победитель аукциона оплачивает стоимость Лота №2 в течении 30 дней с момента проведения аукциона.

Цена Лота №2 установлена независимым оценщиком.

### ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА

**Комплекс зданий и сооружений, объединенных в ЛОТ №2:**

**1)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112496, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, общей площадью 13 623,3 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – цех оконных блоков.

Свидетельство о государственной регистрации от 02.09.2016 года за номером 110/530-17784, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 563 000 рублей, без НДС.**

**2**) Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2775625, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/1, общей площадью 2,129,6 кв. м, целевое назначение – административное помещение, наименование – административное помещение.

Свидетельство о государственной регистрации от 29.04.2017 года за номером 110/1756-206, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**СТОИМОСТЬ: 329 000 рублей, без НДС.**

Капитальные строения по п.п.1–2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003540, зарегистрированного по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/1, общей площадью 3,0596 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 26.01.2017 года за номером 110/530-18312, выданным Барановичским филиалом РУП « Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**3)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112253, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/4, общей площадью 452,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – арочный склад.

**СТОИМОСТЬ: 40 300 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17637, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**4**) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-112254, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/3, общей площадью 1 130,6 кв. м , назначение – здание неустановленного назначения, наименование – прирельсовый склад.

**СТОИМОСТЬ: 90 900 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 12.07.2016 года за номером 110/530-17638, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

Капитальные строения по п.п. 3–4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003525, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/3, общей площадью 0,7480 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17948, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**5)** Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-111817, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 530,9 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – склад арочный.

**СТОИМОСТЬ: 47 300 рублей, без НДС.**

Свидетельство о государственной регистрации от 23.03.2016 года за номером 110/1243-2640, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003524, зарегистрированном по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3/2, общей площадью 0,4697 га, в соответствии со свидетельством о регистрации от 19.10.2016 года за номером 110/530-17947, выданным Барановичским филиалом РУП «Брестского агентства по регистрации и земельному кадастру».

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №2 – 1 070 500 рублей, без НДС.**

Составные части к ЛОТУ №2:
- часть забора – 1040,4 м/п;
- асфальтовое покрытие – 2,234 кв. м;
- помещение сторожа;
- станция пожаротушения;
- ворота.

Оплачиваются победителем торгов (участником) по отдельному договору купли-продажи.

Сумма задатка: 10% от начальной цены Лота №2 в рублях РБ.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк », код 369, г. Барановичи.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению. Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по ЛОТУ №2 в срок до 14.00 04.07.2017 года организатору торгов, председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М., по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

С условиями аукциона также можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 07.06.2017 года.

УНП 400022653

# РУП «ГОМЕЛЬСКОЕ АГЕНТСТВО ПО ГОСУДАРСТВЕННОЙ РЕГИСТРАЦИИ И ЗЕМЕЛЬНОМУ КАДАСТРУ»

объявляет о проведении процедуры переговоров по закупке работ на выполнение текущего ремонта за счет собственных средств служебных помещений тратьего этажа административного здания в г. Гомеле по ул. Полесская, 19Б.

**Переговоры состоятся 13 июня 2017 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Полесская, 19Б, каб. 3-17 (3-й этаж)**

Дополнительную информацию и документацию для переговоров можно получить по адресу: г. Гомель, ул. Полесская, 19Б, каб. 3-17, каб. 3-6, контактные телефоны: 71-08-53, 21-22-15, факс 71-96-58.

ИП Тихонович Юрий Константинович проводит третий повторный открытый аукцион по продаже недвижимого и движимого имущества, расположенного по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Советская, 9А, находящегося на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика»

| № лота | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость предмета торгов без НДС, бел. руб. | Ставка НДС | Сумма НДС, бел. руб. | Цена предмета торгов с НДС, бел. руб. | Сумма шага аукциона в размере 5%, бел. руб. | Размер задатка за участие в аукционе 10%, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Комплекс объектов недвижимого и движимого имущества, расположенных по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Советская, 9А, находящихся на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика», стоимость которого уменьшена на 80%: | шт. | 1 | 807 727,33 | 20 | 161 545,47 | 969 272,80 | 48 463,64 | 96 927,28 |
| | Здание главного производственного корпуса, инвентарный номер №124/С-17630 | | | | | | | | |
| | Водопровод наружный | | | | | | | | |
| | Сеть водопроводная | | | | | | | | |
| | Водопровод наружный | | | | | | | | |
| | Внутренняя канализация | | | | | | | | |
| | Самотечная канализация | | | | | | | | |
| | Забор железобетонный | | | | | | | | |
| | Забор декоративный | | | | | | | | |
| | Забор железобетонный | | | | | | | | |
| | Забор железобетонный | | | | | | | | |
| | Ограждение мусорки | | | | | | | | |
| | Внутриплощадочные дороги и проезды | | | | | | | | |
| | Ворота секционные подъемные СПР 3850*4120 | | | | | | | | |
| | Ворота секционные подъемные СПР 4040*4120 | | | | | | | | |
| | Ворота секционные подъемные СПР 3750*3100 | | | | | | | | |
| | Калитка к воротам секционным подъемным СПР 4040*4120 (размер калитки 970*2000) | | | | | | | | |
| | Котельная, инв. №124/С-17631 | | | | | | | | |
| | Теплотрасса | | | | | | | | |
| | Теплотрасса (участок №3) | | | | | | | | |
| | Пожарный резервуар | | | | | | | | |
| | Трансформаторная подстанция, инв. №124/С-17877 | | | | | | | | |
| | Силовые кабельные сети (здание АБК) | | | | | | | | |
| | Силовые кабельные сети (здание главного корпуса) | | | | | | | | |
| | Силовые кабельные сети (здание склада готовой продукции) | | | | | | | | |
| | Здание склада гаража, инв. №124/С-17628 | | | | | | | | |
| | Здание механической мастерской №124/С-17626 | | | | | | | | |
| | Здание склада тех.материалов, здание склада под картон, здание гаража, инв. №124/С-17624 | | | | | | | | |
| | Здание склада готовой продукции, инв. №124/С-17627 | | | | | | | | |
| | Здание административно-бытового корпуса, инв. №124/С-17634 | | | | | | | | |
| | Здание склада материальных материалов, инв. №124/С-17629 | | | | | | | | |
| | Здание проходной, инв. №124/С-17633 | | | | | | | | |
| | Здание участка пожаротушения, инв. №124/С-17874 | | | | | | | | |
| | Дымовая труба (32 м), инв. №160/С-28863 | | | | | | | | |
| | Дымовая труба (28 м), инв. №160/С-28862 | | | | | | | | |
| 1 | Насосная станция, инв. №124/С-17876 | | | | | | | | |
| | Здание хранения лака, инв. №160/С-28963 | | | | | | | | |
| | Центр раскроя с одной линией распила ЕВ-95 | | | | | | | | |
| | Деревообрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР для фрезерирования | | | | | | | | |
| | Обрабатывающий центр в ЧПУ мод. РОВЕР | | | | | | | | |
| | Обрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР 2.30 | | | | | | | | |
| | Обрабатывающий центр в ЧПУ РОВЕР S K 3 | | | | | | | | |
| | Обрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР С 6.40 | | | | | | | | |
| | Присадочный центр с ЧПУ мод. SKIPPER 100 | | | | | | | | |
| | Калибровально-шлифовальный станок | | | | | | | | |
| | Шлифовальный агрегат с абразивными щетками мод. PROFISANDER-2 | | | | | | | | |
| | Покрасочная кабина, Италия | | | | | | | | |
| | Покрасочная кабина, Италия | | | | | | | | |
| | Покрасочная кабина, Италия | | | | | | | | |
| | Распылительная установка мод. SUPERFICI | | | | | | | | |
| | Сушильная камера вертикальная (CONTIVERT SUPERFIC) | | | | | | | | |
| | Пресс гидродинамический мод. PHF/100 в комплекте | | | | | | | | |
| | Гидродинамический пресс холодного прессования мод. PM/DE/1 LL | | | | | | | | |
| | Весы клеепромазывающие мод. SC2R-FIN | | | | | | | | |
| | Компрессор воздушный винтовой ЕКО 30. Турция VST | | | | | | | | |
| | Осушитель холодным воздухом ННДр300 | | | | | | | | |
| | Компрессор CSB 25/8 | | | | | | | | |
| | Осушитель воздуха мод. ARCTIC F 8000-FINI | | | | | | | | |
| | Котел паровой Е-1-9-Р3 | | | | | | | | |
| | Водогрейный котел КВ-ТС1 | | | | | | | | |
| | Насос UPS 32-30 | | | | | | | | |
| | Насос НГ 1.6-1.6 | | | | | | | | |
| | Насос НГ 1.6-1.6 | | | | | | | | |
| | Установка дозаторная | | | | | | | | |
| | Дымосос ДН-2 | | | | | | | | |
| | Дымосос ДН-6.3 | | | | | | | | |
| | Дымосос ДН-6.3 | | | | | | | | |
| | Компрессор CSA 20/8-50D | | | | | | | | |
| | Обрабатывающий центр с ЧПУ мод. MD DRILL-COMEC | | | | | | | | |
| | Линия для облицовки профилей Barberan | | | | | | | | |
| | Покрасочная камера мод. Р.5.В | | | | | | | | |
| | Пресс АКДА | | | | | | | | |
| | Подающее устройство (клеенамазывающие вальцы) | | | | | | | | |
| | Полуприцеп ПМТ-330 (рег. знак АВ-1 8316) | | | | | | | | |
| | Погрузчик Хели СРСД30 (зав. №01030D8890HJ) | | | | | | | | |
| | Машина погрузочная МП-320 (рег. знак АВ-1 8315) | | | | | | | | |
| | Щетка дорожная НО-86 (зав. №1388) | | | | | | | | |
| | ИТОГО: | | 1 | 807 727,33 | 20 | 161 545,47 | 969 272,80 | 48 463,64 | 96 927,28 |

**Третий повторный аукцион состоится 16 июня 2017 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206.**

Предыдущие объявления о проведении аукционов были опубликованы в газете «Звязда» №44 04.03.2017 года и №68 11.04.2017 года, №82 03.05.2017 г.

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей выданных представителю (для юридических лиц и ИП) или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет Унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика», принимаются с момента опубликования настоящего извещения по **15 июня 2017 года** до 16.30 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10 (десяти) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее пятнадцати банковских дней с момента заключения договора. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки предмета торгов, в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10 % от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет Унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика» №3012000000448 в ЦБУ №122 филиала №113 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Пружаны, ул. Заводская, 16, код 237, УНП 200254688, в срок до **15 июня 2017 года**.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: индивидуальный предприниматель Тихонович Юрий Константинович, адрес: 224033, г. Брест, ул. Сябровская, д. 75, кв. 7, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 80162-58-45-79, 8-029-802-80-00.

Сведения о продавце: Унитарное предприятие «Ружанская мебельная фабрика», Брестская обл., Пружанский район, г. п. Ружаны, ул. Заводская, 16, контактный телефон 8-044-352-11-47.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за три дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 16.30 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206, тел.: 8-029-802-80-00, 80162-58-45-79.

■ Не словам, а справай

# Там, дзе раслі цыбуля і кроп...

## У Гродне на месцы стыхійных дач разбіты сквер

**Гэту тэрыторыю плошчай 5 га ў народзе называлі «шанхаем» з-за шчыльнага размяшчэння ўчасткаў. Мінулай восенню будаўнічая тэхніка зруйнавала іх дзеля таго, каб стварыць тут новы куток адпачынку гараджан.**



### Развалілі развалюхі

Мікраараён Фолюш у Гродне будаваўся для вайскоўцаў. Сюды ў 70-х гадах вярталіся ваенныя з Усходняй Германіі. Навасёлы звярнулі ўвагу на вялікі яр каля дамоў. Ніякіх дакументаў не афармлялі, а пачалі самі па сабе асвойваць тэрыторыю. На плошчы каля 10 га з'явіліся агароды, часовыя забудовы, плоцікі, цяплічкі. Колькі тут было ўчасткаў, наўрад ці хто лічыў, можа нават некалькі сотняў.

Стыхійныя дачныя ўчасткі размясціліся ў маляўнічай зоне на ўскрайку горада, дзе працякае невялікая рачулка Ласасянка. Сюды прыязджаюць адпачыць з усяго горада. На гэту акалічнасць звярнулі ўвагу мясцовыя ўлады. Ды і парадак трэба было наводзіць на зямлі — «шанхай» не ўпісваўся ў воблік гарадскога асяроддзя. Мінулай веснай жыхароў папярэдзілі, каб разбіралі свае развалюхі.

— Адразу было шмат скаргаў і зваротаў, — успамінае **кіраўнік адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Гродна Алег БЯЛІНСКІ.** — Але трэба разумець — агароды ствараліся самазахватам, ніхто права на ўласнасць не даваў. Між іншым, свой ураджай усе паспелі сабраць.

А позняй восенню сюды прыгналі будаўнічую тэхніку, якая падрыхтавала вялізны ўчастак пад будучы сквер.

### Усёй грамадой

Цяпер ужо многія зразумелі — старыя забудовы стрымліваюць добраўпарадкаванне тэрыторыі, якая магла б стаць новай зонай адпачынку і для мікраараёна, і для ўсяго горада. Першыя вынікі не прымусілі доўга чакаць.

— Толькі смецця было вывезена 600 самазвалаў, — заўважае Алег Бялінскі. — Пасля чаго завезлі грунт, каб выраўняць тэрыторыю, а гэта даволі вялізная плошча. Да расчысткі далучыліся многія гродзенскія ўстановы.



У адміністрацыі растлумачылі: работы вядуцца не за бюджэтныя сродкі, а за кошт розных арганізацый — будаўнічых, транспартных, а таксама прыватных прадпрыемстваў горада. Падтрымалі і гараджане. Падчас суботніка сюды прыйшлі амаль 80 мясцовых жыхароў, а ўсіх дабраахвотнікаў было больш за 400. Дарэчы, адным суботнікам не абышліся. Каб паскорыць работы, у маі арганізавалі яшчэ адзін, дзе таксама набралася каля сотні памочнікаў.

— Паступова мы пазбавіліся ад непрывабнай карціны, якая псавала выгляд, — адзначыў Алег Бялінскі, — зараз бераг рэчкі Ласасянкі пачынае нагадваць паркавую зону, хаця работы яшчэ многа.

### Будучыня — за паркам

Былы «шанхай» набывае новыя рысы. За кароткі час пасаджана каля 160 дрэў — бярозак і клёнаў. Дарэчы, усе яны агароджаны і пастаянна паліваюцца. За гэтым сочыць мясцовы ЖЭС. Вызначана некалькі алей, пракладзена дарога. Камунальна-эксплуатацыйным прадпрыемствам устаноўлены дзясятак драўляных лавак, даволі арыгінальных.

Сюды ўжо пацягнуліся жыхары мікраараёна. Далучаюся да жанчын, якія выйшлі пагуляць з сабачкамі. У першую чаргу яны пачынаюць выказваць свае заўвагі:

— На жаль, па дарожцы машыны ездзяць. Нават міліцыя пачала патруляваць...

— Дрэў многа падчас зносу вырубілі, тут і яблыні былі, і грушы, і грэцкія арэхі, і вішні...

— Пачалі, гэта добра, а што далей? Вунь колькі тэрыторыі запусцелай стаіць, і тут трэба пастаянна падкошваць, бо будзе бур'ян...

— У спакоту тут не адпачнеш, бо адкрытая прастора, а там, дзе дрэвы яшчэ стаяць, — сметнік і канавы...

— Каля Ласасянкі таксама хмызняк, хаця сюды многія едуць на пікнік...

— Ніводнай сметніцы няма, можна было каля лаўкі паставіць...

Жанчыны развіталіся і пайшлі збіраць па полі малады кроп. Гэта частка тэрыторыі пакуль нагадвае пустку, а не сквер. І усе ж, згодна з праектам, недзе тут будуць уладкаваны спартыўныя пляцоўкі — для валейбола, футбола.

Група хлопцаў рухаецца з боку мікраараёна. У парку ім пакуль няма чым заняцца, толькі што на лаўцы пасядзець. А зробяць спартыўныя пляцоўкі — можа і моладзь зацікавіцца. Хлопцы згодны, што сквер трэба абжываць, рабіць цікавым і ўтульным.

### ❍ Кампетэнтна:

**Сяргей САРОКА, першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна:**

— У хуткім часе прыступім да прыбірання смецця з астатняй часткі тэрыторыі. Там таксама пракладзём дарожкі, высадзім алею, будзе больш лавак. Маем намер усталяваць кантэйнерную пляцоўку для сметніка.

Думаю, што да восені гэта тэрыторыя значна зменіцца. Пасля ландшафтнай перапланіроўкі з'явяцца газоны з роўнай травой, дзіцячыя пляцоўкі. Ёсць намер высадзіць у цэнтры ёлку, усталяваць асвятленне, каб збіраліся тут гараджане на навагоднія святы.

Марым упрыгожыць парк-сквер скульптурамі, малымі архітэктурнымі формамі. Магчыма, нашы прафесійныя майстры згодзяцца правесці пленэр і падарыць свае творы. Мы разлічваем толькі на спонсарскія сродкі і дапамогу гараджан.

### Напрыканцы

Пачула ў парку, як адна з жанчын сказала: «Дык на суботніку толькі на адну гадзіну выйшлі, працаўнікі...» Сама яна не выходзіла, бо мела тут агарод і лічыць сябе пацярпелай. Затое зараз не супраць прагуляцца па новай дарожцы.

Дарэчы, з другога боку мікраараёна яшчэ застаецца вялікі ўчастак са стыхійнымі дачамі. Такая ж тэрыторыя ў 5 га. Ёсць звесткі, што і там калі-небудзь пачнуць уладкоўваць зону адпачынку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# МАЛАДЫ І ПАСПЯХОВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета за чатыры месяцы ў гаспадарцы надаілі на адну карову на 250 літраў малака больш, чым за адпаведны перыяд летась, «вал» павялічылі на 210 тон. Малако здаецца дзяржаве толькі экстра-класам. Як адзначае Сяргей Гарбачэўскі, нічога надзвычайнага ў гэтым няма. Галоўнае — прытрымлівацца тэхналогіі.

— І ўсё ж, Сяргей Аляксандравіч, за што ўзяліся ў першую чаргу, калі вас прызначылі дырэктарам? — пацікавілася ў яго.

— За ўсё адразу, — адказвае ён. — У прыватнасці, пачалі даводзіць да ладу жывёлагадоўчыя памяшканні на ферме «Добравічы», сваімі сіламі зрабілі агарожу, сянажныя ямы. Гэты комплекс яшчэ не дабудаваны. Крэдытная лінія закончылася, а банку засталіся вінны немалыя сродкі. Будзем павялічваць колькасць жывёлы на гектар сельгасугоддзяў. Больш кароў — больш малака, ад рэалізацыі якога атрымаем прыбытак. І, спадзяюся, да канца года ўвядзём у дзеянне трэцюю чаргу жывёлагадоўчага комплексу.

— Не страшна было ўзваліць на сябе нялёгкую ношу: адна справа быць намеснікам, іншая — адказваць за ўсё асабіста? — дапытваюся ў свайго сураэмоўніка.

— Хацелася паспрабаваць сябе ў новай справе, цікава было: ці атрымаецца? Шмат дапамагаў



дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Нарачанскія зоры». Гаспадарка, якую ўзначальвае Генадзь Мечыслававіч Кучко, моцная і паспяховая. Звяртаўся і звяртаюся да яго па розных пытаннях, вопытны кіраўнік заўсёды дасць каштоўную параду, падтрымае добрым словам, — прызнаўся Сяргей Гарбачэўскі.

Сяргей Аляксандравіч сфарміраваў каманду аднадумцаў. Ёсць аграном, механік, ветурач, энергетык. Не хапае толькі заатэхніка. Забралі ў армію. Але пасля службы павінен вярнуцца на ранейшае месца работы. Перавагу Сяргей Аляксандравіч аддае маладым. Як сцвярджае, з імі прасцей працаваць: не абраслі стэрэатыпамі, лягчэй засвойваюць новыя тэхналогіі, больш ініцыятыўныя, амбіцыйныя, выконваюць усе распараджэнні. «Па ўсіх пытаннях мы можам спрачацца. Мяне можна ў нечым пераканаць. Але калі я прыняў рашэнне, то яго аднаэначна павінны выконваць», — кажа суразмоўнік.

— А ў вас ёсць амбіцыйныя планы?

— Планаў шмат. Але на рэалізацыю ўсіх адначасова не хапае сродкаў. Трэба наладжваць больш эфектыўную эканоміку, павялічваць пагалоўе жывёлы, зарплату. Будзе зарплата — будуць і людзі, — лічыць Сяргей Гарбачэўскі. Па яго словах, моладзь цяпер гатова працаваць з раніцы дапазна. Галоўнае, каб былі дастойныя заробкі і жыллё. У наступным годзе кіраўнік плануе ўзвесці гаспадарчым спосабам пяць домікаў. «Браць крэдыт і будавацца падрадным спосабам немэтазгодна. Тым больш што ў гаспадарцы ёсць брыгада будаўнікоў. Думаю, справімся сваімі сіламі».

**«Моладзь цяпер гатова працаваць з раніцы дапазна. Галоўнае, каб былі дастойныя заробкі і жыллё. У наступным годзе кіраўнік плануе ўзвесці гаспадарчым спосабам пяць домікаў».**

Сам Сяргей Гарбачэўскі жыве ў Сцешыцах, за дзесяць кіламетраў ад месца работы. У маладога бацькі тры сыны: старэйшаму — шэсць гадоў, сярэдняму — тры, а малодшаму споўнілася толькі паўгода. Дзецьмі займаецца жонка.

— А хто яна па спецыяльнасці?

— Не паспела набыць, — усміхаецца Сяргей. — Мы пажаніліся, калі мая выбранніца вучылася ў 11 класе.

— І чаму так паспешліва пабраліся шлюбам? Відаць, на гэта была важкая прычына?

— Гэта не тое, што вы думаеце. Проста было вялікае каханне, — парыруе мужчына ў адказ.

### ❍ У тэму

**Генадзь КАСЦЕВІЧ, намеснік старшыні Вілейскага райвыканкама па эканоміцы:**

— Сяргей Аляксандравіч — годны малады чалавек. Варта было набрацца мужнасці, каб прыехаць у іншую вобласць, не пабаяцца ўзначаліць адсталую шматпрофільную гаспадарку і за два гады палепшыць вынікі дзейнасці. Ён павялічыў аб'ёмы прадукцыі жывёлагадоўлі, раслінаводства. Каровы на гэтай ферме даюць па 13—14 літраў малака штодзень. А пачынаў з 10 літраў. Малады кіраўнік думае аб перспектыве развіцця сельгасарганізацыі, працуе над зніжэннем сабекошту прадукцыі, павышэннем зарплаты. Стварае дадатковыя рабочыя месцы, наводзіць парадак на зямлі, працуе над культурай земляробства. Наогул, у раёне робяць стаўку на маладыя кадры, і даволі паспяхова. У свае 28 гадоў Сяргей Гарбачэўскі не самы малады кіраўнік гаспадаркі. Нядаўна прыйшоў яшчэ адзін — дваццаціпяцігадовы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

Ігуменскі тракт
№9 (188)

**СЁЛЕТА адзначаецца 700-годдзе Навагрудскай епархіі і 25-годдзе аднаўлення яе дзейнасці. Мерапрыемствы, звязаныя з гэтай датай, ужо праходзяць у горадзе і раёне, і яшчэ шмат што запланавана. Нядаўна адбылася ўстаноўка звона на Свята-Мікольскім саборы. Звон спецыяльна адлілі і прывезлі з Расіі. Ён мае своеасаблівае гучанне. Плануецца таксама ўсталяванне памятных знакаў у горадзе і раёне.**

Яны будуць невялікага памеру — два на два метры ў шырыню і шэсць у вышыню. Унутры некаторых з іх будзе вісець звон.

У Навагрудку памятны знак будзе ўсталяваны на скрыжаванні вуліц Мінскай і Свярдлова (калісьці там стаяў Траецкі храм, які, на жаль, не захаваўся да нашага часу з-за шматлікіх ваенных падзей). Ён будзе падобны на колішнюю царкву, толькі ў мініяцюры. Таксама там змесцяць інфармацыйную шыльду са звесткамі пра стварэнне Навагрудскай епархіі і тую ролю, якую яна выконвала ў свой час на Навагрудчыне.

Памятныя знакі такога ж кшталту будуць устаноўлены і ў аграгарадках Навагрудскага раёна — у Кашалеве, у г. п. Любчы. У Нягневічах — на развілцы вуліц Леніна і Паплаўскай. У Брольніках — на вуліцы Цэнтральнай, каля развілкі дарог насупраць млына. Таксама на ўездзе ў Шчорсы, у кірунку Лаўрышаўскага манастыра. Плануецца ўстаноўка і пры ўездзе ў вёску Валеўку.

Памятныя знакі зробяць у форме каплічак, але ўсе яны будуць разнапланавымі.

— Навагрудчына цікавая і сваім ландшафтам — нізінамі і пагоркамі. Таму, праектуючы помнікі, стараемся абазначыць усе мясцовыя асаблівасці, — адзначае **загадчык сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама Наталля ЖЫШКО.** — Напрыклад, у Любчы ёсць замак, рэнесансны пасёлак — у старой частокі мястэчка вельмі адметнае планаванне. Таму важна, каб памятны знак адпавядаў гэтай мясцовасці. У Кашалеве можна ўбачыць узвышша, а затым упадзіну, гэта таксама важна ўлічыць. Праекціроўшчыкі яшчэ працуюць над формай аб'ектаў, і мы дбаем пра тое, каб яны ўпісаліся ў рэгіянальныя асаблівасці месца і неслі ў сабе пэўныя гістарычныя звесткі. Працуем таксама над дакументацыяй. Узгадненне на правядзенне работ з Міністэрства культуры мы ўжо атрымалі, а зараз рыхтуем усё, каб прадставіць праекты, макеты на мастацкім савеце ў Гродне.

Праектнай арганізацыяй выступае мясцовае прадпрыемства «ВІДЗІ-Арх». Сродкі на стварэнне памятных знакаў — пазабюджэтныя. Гэта грошы гараджан, навагрудскіх прадпрыемстваў і епархіі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*Навагрудскі раён.*

■ Духоўнасць

# ЦАРКВА Ў МІНІЯЦЮРЫ

## На Навагрудчыне ўсталююць памятныя знакі



Пантэон Айчыны

# ВІЦЕНЬ (?—1315)

**Не меней загадкавая асоба вялікага князя літоўскага Віценя. Ягонае славянскае імя (як і яго брата, полацкага князя Воіна) нібыта сведчыць, што ён быў славянінам. А некаторыя рускія летапісы выводзяць яго то са смаленскіх, то з полацкіх князёў. Ордэнскі храніст Пётр з Дусбурга называе Віценя «сынам караля Літвы» Пукувера або Лютавера. Віценю прыпісваецца прыняцце дзяржаўнага герба «Пагоня», далучэнне да ВКЛ Падляшша. Паводле іншых легендарных звестак, Віцень служыў у Тройдзеня каморнікам і за свае «цноту і добрае захаванне» так палюбіўся вялікаму князю, што той зрабіў яго маршалкам. І на гэтай высокай пасадзе Віцень праявіў сябе так, што пасля смерці Тройдзеня яго выбралі вялікім князем. Прыгожая легенда, якая даводзіла легітымнасць улады Віценя і яго паслядоўнікаў, бо лічылася, што дынастыя Гедзімінавічаў паходзіць ад яго. З Віценем да ўлады ў ВКЛ прыйшла новая дынастыя, карані якой губляюцца ў невядомасці, а імёны яе прадстаўнікоў (Гедзімін, Альгерд, Кейстут, Карыят, Скіргайла і г. д.) выводзяць нас на скандынаўскія (прынамсі, дацкія) і кельцкія вытокі.**



Віцень. З «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі». А. Гваніні 1578 г.

Пэўна, Віцень, як і яго браты Гедзімін і Воін, належаў да ваеннай кансорцыі, што абслугоўвала Нёманскі гандлёвы шлях і якая вядомая ў летапісах пад назвай Літва (як у свой час аналагічная кансорцыя ваяроў і купцоў Русь). Менавіта сярод правадыроў дружын Літвы і шукалі панёманскія гарады сабе князёў, ваяўнічых і модных. Іх паслугамі карыстаўся і Полацк. Мы не можам нават вызначыць іх этнічную прыналежнасць. Звычайна іх лічаць балтамі. Але ці мог балт насіць славянскае імя Віцень, ці кельцкае Гедзімін, ці дацкае Альгерд? Не ведаем, ці былі яны паганцамі (як прадстаўлены ў рускіх і нямецкіх летапісах і хроніках), ці належалі да народных канфесій — арыянства ці багамільства. Вось колькі пытанняў, на якія не могуць або не хочуць адказаць гісторыкі. Напрыклад, чаму полацкі епіскап Якаў у дамове з Рыгай (дзесьці 1309 год) называе Віценя «сынам маім», як сваё духоўнае чада?

Пазнейшыя ідэалагічныя штампы сапраўды апаганілі вобразы нашых уладароў, ператварыўшы іх у дзікіх, жорсткіх паганцаў, што і толькі ўмелі махаць мячамі ды праліваць кроў. Вось той жа Віцень, які, паводле нямецкага храніста, бурыць касцёлы і ўсклікае да хрысціян: «Дзе Бог ваш? Чаму ён не дапамагае вам, як нашы багі дапамаглі цяпер і іншыя разы?» Калі чытаем гэтую выдумку, сапраўды можа скласціся ўражанне, нібыта Віцень люты паганец. Толькі вось чамусьці храніст не напісаў, што гэты паганец запрасіў у Наваградак каталіцкіх манахаў і заснаваў там касцёл, які, дарэчы, і спалілі пасля хрысціяне-крыжакі. Невядома яму і дзейнасць Віценя па заснаванні Літоўскай праваслаўнай епархіі.

Віцень правіў і як хрысціянскі ўладар, падтрымліваючы і праваслаўе і каталіцтва, і як паганскі, захоўваючы паганства, у якім знаходзіліся паганцы-балты і нават часткова славяне. Можна сказаць, гэта быў народны правадыр. Як тут не прыгадаць тагачасныя Альбігойскія войны, калі «правільныя хрысціяне» рэзалі «няправільных хрысціян» і крывёю котараў і вальдэнсаў быў затоплены квітнеючы Лангедок. У Вялікім княстве такога не адбылося ні пры Віценю, ні пры ягоных паслядоўніках.

Хоць Віцень задушыў паўстанне жамойтаў, якія не прызнавалі яго ўлады, але гэта было не татальнае знішчэнне людзей і іхняй веры, а вымушаная палітычная акцыя. За жамойтамі-паўстанцамі стаяў ордэн, які ўмела скарыстаўся жамойцкім сепаратызмам. У адрозненне ад Міндоўга, які шчодра раздаваў і свае, і чужыя землі крыжакам, абы з іх дапамогай утрымаць уладу, Віцень за кожны кавалак сваёй зямлі змагаўся і прэтэндаваў і на чужую, бо хацеў зрабіць сваёй. Ён не толькі абараняе Вялікае Княства, але і робіць спусташальныя паходы ў Лівонію, Прусію, Мазовію, актыўна падтрымлівае Рыгу ў барацьбе з рыцарамі. Ягонае войска разам з рыжанамі 1 чэрвеня 1298 года на рацэ Трайдэры разбіла ўшчэнт ордэнскае войска. Такога паражэння Лівонскі ордэн ніколі не ведаў. На дапамогу лівонскім рыцарам прыйшлі тэўтонскія рыцары. Пад іх ударамі літвіны пакінулі Лівонію. Аднак мір, заключаны Віценем з Лівонскім ордэнам, на доўгія гады звязаў лівонцам рукі. Галоўным ворагам ВКЛ зрабіўся Тэўтонскі ордэн з найлепшай тагачаснай арміяй. Тэўтонскія рыцары сустрэлі годнага саперніка, аб лёгкіх перамогах трэба было забыцца. Усе спробы крыжакоў захапіць Гародню былі няўдалымі. Сам Віцень і яго паплечнікі наладжвалі належны адпор агрэсарам, а паход у 1314 годзе на Наваградак увогуле закончыўся катастрофай. Крыжацкая армія, пазбаўленая дружынай Давыда Гарадзенскага складоў правіянту, вярнулася ў Прусію значна зменшанай і поўнасцю дэмаралізаванай. Аднак і Віцень зведаў прыкрыя паражэнні. Гэтак, 7 красавіка 1311 года ягоная дружына была разбіта ў Прусіі ордэнскім войскам на чале з вялікім камандорам Генрыхам фон Плоцке. Віцень з рэшткамі свайго войска вырваўся з акружэння і сышоў ад пагоні. Нельга не адзначыць, што Віцень, як сапраўдны дружынны правадыр, асабіста вадзіў сваіх воінаў у паходы, плячо ў плячо змагаўся з імі супраць ворагаў. А жыццё ваенных правадыроў небяспечнае. Любая бітва можа стацца для іх апошняй. Зноў-такі мы нічога не ведаем пра смерць Віценя. Ці ён загінуў у 1315 годзе падчас аблогі крыжацкага замка Хрыстмемель, ці, як сцвярджалі крыжакі, яго забіў «канюшэц» Гедзімін, ці, паводле беларускіх летапісаў, ён загінуў ад удару маланкі. Сапраўды нейкая міфічная смерць міфічнага героя.

Прынамсі, такім Віцень уяўляўся беларускім летапісцам XVI стагоддзя, ды і ягонае жыццё ахутана міфамі. Напрыклад, гісторык Тэадор Нарбут, спасылаючыся на нейкі рукапіс, расказваў захапляльную гісторыю. Нібыта Віцень разам са сваім бацькам Лютаверам княжыў у Полацку, біўся з татарамі і трапіў да іх у палон. Некалькі гадоў правёў у абозе хана Батыя. Пасля вяртання з няволі ён княжыў у Полацку, пакуль яго па просьбе Тройдзеневага сына манаха Лаўрэнція на з'ездзе літвінскіх станаў не выбралі вялікім князем літоўскім. Сюжэт для добрага гістарычнага рамана. Нельга не заўважыць сувязь Віценя з Полацкам, нават полацкага князя Воіна лічаць ягоным братам. Таму, пэўна, у летапісах і з'явілася туманнае паведамленне, нібыта ў 1307 годзе Віцень па просьбе палачан выгнаў з Полацка лівонскіх немцаў, што атабарыліся там на правах новых гаспадароў. Менавіта з імем Віценя гісторыкі звязваюць далучэнне Полацкай зямлі да ВКЛ, хоць дакладней казаць аб іх саюзе. Пэўна, асоба Віценя прыцягнула сімпатыі палачан — і ён стаў «сынам» полацкага епіскапа.

Калі казаць, што гісторыя — гэта міфалагізаванае апавяданне аб мінулым, дык Віцень якраз ідэальна ўпісваецца ў яе, як герой і правіцель, своеасаблівы наш кароль Артур, але ў адрозненне ад яго не міфічны, а рэальны.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**



Рыцары Тэўтонскага ордэна.

■ Імпрэза

# Форум у форуме

**Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» ў Клімавіцкім раёне стаў пляцоўкай для правядзення першай міжрэгіянальнай сустрэчы паміж актывістамі маладзёжнага руху Беларусі і Расіі**



Фота БЕЛТА.

Шаснаццаты па ліку фестываль «Залатая пчолка» сабраў больш за 700 удзельнікаў з 8 краін свету. На працягу 4 дзён на яго творчых пляцоўках праходзілі конкурсныя адборы і канцэрты, праводзіліся выстаўкі і інтэрактыўныя гульні, працавалі атракцыёны і гандаль.

Дзень моладзі стаў новаўвядзеннем дзіцячага свята і добра ўпісаўся ў гэты фармат. У Клімавічы прыехала маладзёжная парламенцкая дэлегацыя Бранскай вобласці на чале з начальнікам аддзела ўпраўлення маладзёжнай палітыкі і грамадскіх праектаў Дэпартамента ўнутранай палітыкі Бранскай вобласці Алегам Шэвелевым. Яна сустрэлася з маладзёжным актывам Магілёўскай вобласці за круглым сталом і падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі на сваім узроўні.

Самым цікавым, але гэта я сёння разумею, у тым куфры быў адваротны бок цяжкога века. Там жоўтыя дошкі пакрывала павута надпісаў, зробленых звычайным алоўкам, хімічным, каляровым сінім, а дзе-нідзе — вугалем. Гэта — дзедаў дзённік. Усе тыя кароткія надпісы з датамі тычыліся жыцця. «Апарос. Кнур. Злучка. Ацёл. Пасеяў жыта. Пасадзіў бульбу. Паганялі бульбу. Зжалі жыта. Купіў парася. Прадаў парасят. Пасадзіў дзве яблыні наліў і штрыфель...» Запісы тыя вяліся з сорак шостага года па семдзесят восьмы.

«Слухай, дзед, вось табе сшытак...» — прапанаваў і даў дзеду альбомчык для малявання. «Сшытак можа згубіцца і не знойдзеш. Скрасці яго можна... А бабін куфар, як стаяў, так і будзе стаяць. Хто яго возьме?» — дзед паклаў руку на чорнае века.

Шкадую, што не перапісаў, не перамаляваў, не сфатаграфаваў усе тыя надпісы, якія накладаліся адзін на адзін, змяняліся, а некаторыя і прападалі, выцертыя дзедавай рукой...

## САПРАЎДНЫ ЧАС

Вечар. Апошні пакупнік замаўляе пляшку гарэлкі і выбірае гатунак цыгарэт. Прадавачка прыспешвае, кажа што праз тры мінуты зачыняюцца. Мужчына просіць «Ротманс» і падае картку. Гучыць пяць пікаў. Праз паўмінуты прадавачка кажа: «На вашай картачцы не хватает срэдств».

А пакупнік бутэльку ў кішэнь схаваў.

Прадавачка чырванее і кажа: «Заўтра можыце прынесці грошы?»

«Так, так... Заўтра, змагу. З мяне шакаладка!»

Вечар. Аптэка побач з «Цэнтральным». Да закрыцця тры мінуты. Малады чалавек набывае лекі. Радуецца, што ў гэтай аптэцы яны ёсць. Падае картку. Пяць пікаў. На картцы не хапае сродкаў.

Маладзён разгублены. Аптэкарка пачынае забіраць лекі, а ён трымае кардонку з ампуламі і кажа: «У яе трыццаць дзевяць... дзевяць...»

«Багі глядзяць на нас і забаўляюцца», — чытаў некалі ў кніжцы.

## КАРЛ ГАЛЬДОНІ

Позні вечар. Мароз. Са знаёмым акторам у цёмным парку гаворым пра Карла Гальдоні і яго знакамітыя п'есы. Ён сыпле ў кармушкі семкі і кажа, выдыхае пару: «Гальдоні ставілі і будуць ставіць, а вось птушкі, птушкі... Добра, калі да вясны дажывуць...» Я прытрымліваю кармушку, зробленую з пластыкавай бутэлькі, каб не гайдалася.

## КАПЕЙКА

Учора ў «Цэнтральным», у чарзе да касы, у жанчыны выпала адна капейка. Жанчына махнула на яе рукой, падымаць не стала. І ўсе, хто стаяў у чарзе, не паднялі. Капейка засталася ляжаць. А я падняў...

Я — беларус

■

■ Увага, конкурс!

# Хто лепш за ўсіх асвятляе юбілей беларускай кнігі?

**Выдавецкі дом «Звязда» і Беларускі саюз журналістаў працягваюць сумесны творчы конкурс «Спадчына». Ён прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Удзельнічаць у ім могуць рэгіянальныя і карпаратыўныя выданні краіны.**

На суд журы будуць вынесены работы, якія ўбачаць свет да 30 чэрвеня. Іх неабходна падаць у Камітэт па прэміях і прафесійнай этыцы журналіста. **Публікацыі можна прынесці асабіста або даслаць па пошце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Сурганава, 48а, Беларускі саюз журналістаў. Часу на гэта засталося не так і шмат — да 15 ліпеня.**

Лаўрэаты конкурсу будуць вызначаны па шасці намінацыях. Журы адбярэ найлепшае карпаратыўнае і рэгіянальнае выданне, дзе асвятляецца тэма юбілею айчыннага кнігадрукавання, і публікацыі ў іх, а таксама фотасюжэт і літаратурны твор. Цырымонія ўзнагароджвання адбудзецца на Дні беларускага пісьменства ў Полацку. Пераможцам уручаць дыпломы ГА «БСЖ» і каштоўныя падарункі.

Плануецца, што ў Выдавецкім доме «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі выйдзе зборнік найлепшых матэрыялаў конкурсу. Падрабязнае Палажэнне аб конкурсе — на сайце zviazda.by

***Нагадваем таксама нашым чытачам, што вы яшчэ паспяваеце прыняць удзел у віктарыне «Мая Скарыніяна», якую «Звязда» праводзіць сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай. Пераможцаў чакае бясплатная падрабязная экскурсія па галоўнай кніжнай скарбніцы краіны. Адказы на пытанні першага тура прымаюцца па 10 чэрвеня. Самі пытанні — у нумары «Звязды» ад 6 мая або на нашым сайце zviazda.by.***

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*schklennik@zviazda.by*

■

■ Дзецi вайны

# СЯМЕЙНЫЯ ХРОНІКІ, або Споведзь былога малалетняга вязня

**Аляксандр Савiцкi, на жаль, ужо пайшоў з жыцця. Але яго ўспамiны беражлiва захоўвае Лiдзiя САЛОДКIНА, яго дачка. Тэма вайны доўгi час была закрытая ў iх сям'i, i Лiдзiя Аляксандраўна шкадуе, што шмат чаго яна не паспела спытаць у бацькi. Ён перажыў шмат пакут, не аднойчы глядзеў смерцi ў вочы, але нават у палоне верыў, што вернецца дадому. Яму было ўсяго 14 гадоў, калi немцы прыйшлi ў iх вёску Пiлькавiчы, што на Вiцебшчыне.**

## Застацца чалавекам

Мацi з дзяцiнства вучыла дзяцей: злом зло не пераможаш, зло пераможа толькi любоў. У iх шматдзетнай сям'i, дзе расло 9 хлопчыкаў i дзяўчатак, гэтую аксiёму засвоiлi ўсе. Гэта дапамагло нават у нечалавечых умовах застацца людзьмi. Яшчэ быў жывы iх бацька — герой першай сусветнай вайны, якi вярнуўся дадому iнвалiдам. З-за атручвання ядавiтымi газамi яму выдалiлi частку страўнiка. Чалавек ён быў вельмi працавiты i паспеў усяму навучыць свайго дапытлiвага сына. Хлопец мог нават з абалонкi снарада зрабiць свяцiльню, з кавалачка волава — лыжку.

Немцы зраўнялi вёску з зямлёй, прыходзiлася жыць у зямлянках. Чацвёра дзяцей з iх вялiкай сям'i памерлi ў вайну ад голаду. Чужынцы называлi сябе гаспадарамi, да сялян ставiлiся з пагардай, а яўрэяў наогул не лiчылi людзьмi, здзекавалiся з iх i расстрэльвалi. Аднойчы змучаных яўрэяў паставiлi па адзiн бок дарогi, усiх астатнiх па другi i загадалi забiваць адно аднаго. Абяцалi, што толькi тады злiтуюцца над яўрэямi. Некалькi знямоглых ад катаванняў людзей пачалi кiдаць зямлю ў сваiх суседзяў. «Гэта яны ад адчаю», — шапнула Сашы мацi. Насупраць iх стаяла маладая яўрэйка з дзiцем. Яна высока трымала галаву, усiм сваiм вiдам дэманструючы, што смерць для яе лепшае выйсце. Немцы спрабавалi распалiць у людзях нянавiсць адно да аднаго, але не маглi зламiць iх волю.

## Свае i чужыя

Вайна навучыла падлетка добра разбiрацца ў людзях. Адзiн нямецкi афiцэр быў крыху не падобны на астатнiх. Аднойчы Саша выратаваў яго сабаку, i немец за гэта даў яму пару кавалачкаў цукру i некалькi цыгарэт. Хлопчык пабег быў дахаты, прадчуваючы, як узрадуецца курыву дзед, але дарогу нечакана заступiў палiцай. Ён усё бачыў i загадаў аддаць яму падарункi. Нахабнiка прыпынiў рэзкi вокрык таго самага немца, якi на рускай мове выляяўся: кончыцца вайна, немец паедзе да маткi, рускi вернецца да хаткi, а вы, бобiкi, рыхтуйце сабе дамавiны.



Лiдзiя Аляксандраўна аднавiла сямейную хронiку.

Потым гэты ж немец выратаваў вёску ад знiшчэння. Спецыяльна прыехаў на матацыкле, каб папярэдзiць, што назаўтра адбудзецца аблава. Ноччу ўсе жыхары падалiся да партызан. Саша з такiмi ж, як ён, падлеткамi цягаў схаваную ад чужынцаў зброю ў лес. I не паспеў схавацца, калi на дарозе нечакана з'явiлiся людзi ў нямецкiх касках. Яго не расстралялi, але ён на сабе выпрабаваў усе нягоды нямецкага палону. З роднай Беларусi яго вывезлi на Нямеччыну. У канцлагеры, куды ён трапiў, палонных жорстка бiлi, прымушалi многа i цяжка працаваць i амаль не кармiлi. Пачалася эпiдэмiя, людзi памiралi сотнямi. Саша таксама захварэў, але выжыў. Ён быў яшчэ зусiм слабы, калi яго разам з iншымi прымусiлi цягаць трупы. Сярод памерлых быў i яго найлепшы сябар. Ахоўнiк убачыў, як хлопчык на развiтанне дакрануўся да рукi таварыша, i з усёй сiлы ўдарыў яго ў спiну прыкладам. Ад болю пацямнела ў вачах, але падлетак змог падняцца. Чапляцца за жыццё прымушала мацi, якая чакала яго дома. Ён гэта так добра адчуваў, што часам нават чуў яе голас.

## Дзякуй, фрау



Аляксандр САВIЦКI выжыў толькi таму, што дома яго чакала мацi.

Палонных вызвалiлi амерыканцы. Хацелася хутчэй дадому, але гэты момант усё адкладваўся. Вызвалiцелi казалi, што шмат часу трэба для праверкi дакументаў. Iшлi месяцы, нават гады, але ўсё заставалася па-ранейшаму. Хлопцу некалькi разоў прапаноўвалi пайсцi вучыцца i застацца ў Германii. Казалi, што на радзiме ён зноў трапiць у палон. Але ён рашуча адмаўляўся. I чакаў.

Мясцоваму насельнiцтву дазволiлi выбраць сярод былых палонных памочнiкаў для гаспадаркi. Саша быў самы худы i знясiлены, але нечакана яго за руку ўзяла нейкая жанчына, чымсьцi падобная на яго мацi. На ўсё жыццё ён запомнiў яе сумныя блакiтныя вочы. Яна заўсёды была акуратна апранута, а паверх адзення насiла бялюткi фартух. Жанчына прывяла яго да сябе дамоў, i падлетку падалося, што ён трапiў у рай. За час сваёй нявол i ён паспеў адвыкнуць ад дамашняй утульнасцi. Разам з жанчынай жылi дзве дарослыя дачкi — у адной з якiх было маленькае дзiця — i брат, паранены на фронце. Ён вельмi кульгаў, а рукi трэслiся так, што нават лыжку з супам ён не мог самастойна данесцi да роту. Аднойчы Саша ўбачыў, як той хацеў дапамагчы сястры, але ў яго нiчога не атрымалася. I тады дарослы мужчына заплакаў, як малое дзiця.

Саша быў для сямейства сапраўдны знаходкай. Па гаспадарцы ён умеў рабiць усё, што патрабавалася ад мужчыны. З вайны не вярнулiся муж гаспадынi, яе сын i зяць. I падлетак усёй душой спачуваў гэтым людзям, якiя прынялi яго ў сваю сям'ю. Для iх ён таксама стаў сваiм. Жанчына, як i родная мацi, ведала гаючую сiлу траў i лячыла яго балючыя рубцы. Яна ведала, як ён сумуе па доме. I не стала затрымлiваць. Дала адзенне свайго сына i загадала дачцэ правесцi хлопца да савецкай воiнскай часцi. Звычайна дакументы правяралi на кожным кроку, але маладым людзям пашчасцiла. Яны беспрашкодна дабралiся да КПП, дзе яго прынялi дзяжурны. Ён дапамог юнаку даехаць да чыгуначнага вакзала i асабiста паклапацiўся, каб яму зрабiлi часовы дакумент. Дарога дадому была адкрыта.

У той самы момант, калi цягнiк павiнен быў ужо адысцi ад перона, вочы хлопца выхапiлi з натоўпу знаёмы твар з белай хустачкай на галаве. Наколькi можна было, ён высунуўся з вагона i закрычаў: «Danke, Frau!». «Mein Alex», — ледзь данеслася да яго ў адказ...

## Верш для дзеда

Аляксандр Савiцкi вярнуўся дадому, але хутка лёс закiнуў яго спачатку ў Казахстан, а потым у расiйскi горад Чыту. Ён быў сумленным работнiкам i пяшчотным бацькам. Працаваў спачатку электрыкам, потым будаўнiком. Дома ўся мэбля была зроблена выключна яго рукамi. У Лiдзii Салодкiнай i цяпер ёсць тумбачка, якая захавала цяпло бацькавых рук. Апошнiя гады свайго жыцця ён жыў у Асiповiчах пад доглядам дачкi. I час ад часу ўспамiнаў сваё ваеннае дзяцiнства. Лiдзiя Аляксандраўна ўспамiнае, што ў яго быў сшытак, куды ён нешта запiсваў. Але пасля смерцi бацькi знайсцi яго не атрымалася. I тады дачка сама напiсала так званую сямейную хронiку, дзе ад першай асобы перадала бацькавы ўспамiны. У асiповiцкай школе №2, дзе жанчына працавала настаўнiцай i дзе вучылася яе ўнучка Ангелiна, зацiкавiлiся гэтай гiсторыяй. Ангелiна перапрацавала яе i здала на конкурс. А яшчэ яны ўсёй сям'ёй склалi верш, прысвечаны дзеду. Ён не ваяваў са зброяй у руках, але ўсё яго жыццё было сапраўдным прыкладам мужнасцi. I гэтым нельга не ганарыцца.

**Нэлi ЗIГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


ОСТРОВ ЧИСТОТЫ

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ЛЕТНЯЯ УДАЧА ВМЕСТЕ С НЭФИС!»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (Далее Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. №2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №590828925.

Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, аг. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Летняя удача вместе с Нэфис!**»

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

15.06.2017 г. – 31.08.2017 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», руководитель отдела маркетинга.

Члены комиссии:

1. Самусев Артем Сергеевич, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по маркетингу.
2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.
3. Короткевич Анастасия Евгеньевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», юрисконсульт.
4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Биолан», «Bimax», «AOS», «Sorti», реализуемой в дискаунтерах «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 15 июня 2017 года по 31 июля 2017 года включительно:

1. Совершить покупку продукции торговых марок «Биолан», «Bimax», «AOS», «Sorti» на сумму 15 рублей и более в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
2. Получить у кассира магазина анкету участника и заполнить ее, указав:
   • фамилию, имя, отчество;
   • возраст (полных лет);
   • город;
   • телефон для связи с указанием кода города, либо кода мобильного оператора;
   • почтовый адрес, индекс;
3. Приложить копию чека к анкете.
4. Вернуть заполненную анкету кассиру магазина.

К участию в Розыгрыше не допускаются лица, не указавшие свои ФИО, возраст, город, телефон для связи с указанием кодов, почтовый адрес и индекс, и не приложившие копию чека.

Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

Участнику необходимо сохранить оригинал кассового чека вплоть до окончания рекламной игры.

Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, отсутствие копии чека, которая должна быть приложена к анкете, или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете с высланной копией чека.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз, каждый раз заполняя анкету участника.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 32 127,33 (Тридцать две тысячи сто двадцать семь) рублей, 33 копейки с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Интернет-планшет I-Pad Apple mini 4 Wi-Fi +Cellular 32GB Space Model A1550 и денежное вознаграждение | 5 | 1086,00 | 5430,00 |
| | | 5 | 145,69 | 728,45 |
| 2 | Мультиварка Redmond RMC-M4510 черный и денежное вознаграждение | 20 | 159,50 | 3190,08 |
| | | 20 | 7,25 | 145,00 |
| 3 | Холодильник-морозильник Bosch KGN 39VP15R, апробационный тип KRKK-GN39A и денежное вознаграждение | 10 | 1210 | 12099,96 |
| | | 10 | 164,22 | 1642,20 |
| 4 | Кофемашина автоматическая Philips Series 2000 Vapore CMF bk 8649/01 и денежное вознаграждение | 10 | 788,00 | 7880,04 |
| | | 10 | 101,16 | 1011,60 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 9 августа 2017 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Стороже́вская, 15, комната переговоров.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используется лототрон и анкеты участников.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышных анкет получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из лототрона.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 15 августа 2017 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т.п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и оригинала кассового чека на покупку товаров, по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, с 16 августа по 31 августа 2017 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.

Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза, или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза), победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 25.08.2017 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10:00 до 17:00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство №3021 о государственной регистрации рекламной игры «Летняя удача с Нэфис», зарегистрированной 29 мая 2017 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

## Марына СЛУЦКАЯ:

# «ПАСЛЯ АЛІМПІЯДЫ Я СТРАЦІЛА СЯБЕ»

**Самая паспяховая дзюдаістка краіны расказала, чаму не трапіла на Гульні ў Бразілію, навошта так рана пачала трэнерскую кар'еру і чаму яе не пускалі ў начныя клубы сталіцы.**

Марына Слуцкая ў сёлетнім сезоне пабіла ўсе рэкорды: упершыню ў гісторыі сярод беларусаў выйграла спаборніцтва Гран-пры і чэмпіянат Еўропы, а пасля турніру Вялікага шлема, дзе стала трэцяй, узначаліла сусветны рэйтынг дзюдо ў катэгорыі звыш 78 кг.

— Вельмі задаволеная, як для мяне складваецца старт сёлетняга сезона. Лепш, чым ёсць, ужо не трэба. Добра было б пратрымацца ў такой форме да чэмпіянату свету, які будзе ў канцы жніўня. Усё ж першынство Еўропы і свету — для нас галоўныя старты сезона. Таму, калі стала першай на кантыненце, вельмі ўзрадавалася, эмоцый было нашмат больш, чым ад навіны, што ўзначаліла сусветны рэйтынг. Хоць ён таксама важны, ад рэйтынгу залежыць жараб'ёўка на спаборніцтвах: чым вышэй спартсменка ў выніковым спісе, тым менш шанцаў сустрэцца з лідарамі дзюдо на першых этапах турніру.



## «Пасля Гульняў у Лондане наша дзюдо трапіла ў яму»

Нягледзячы на свой узровень, па дзіўным збегу абставін Слуцкая не трапіла на Алімпіяду ў Рыа. Каб адабрацца туды, ёй не хапіла ўсяго 40 рэйтынгавых ачкоў.

— Цяпер шукаць вінаватых няма сэнсу. 40 ачкоў — гэта адна выйграная сутычка на чэмпіянаце свету, з якога мяне знялі. Афіцыйная прычына — не выкананне трэнерскіх установак. Гучыць дзіўна... Да гэтага мяне не павезлі яшчэ на некалькі турніраў. А я чалавек, які не можа працаваць у стрэсе, у канфлікце, гэтая праца не прыносіць ні задавальнення, ні выніку.

Цікаўлюся ў Марыны, з чым, на яе погляд, звязаны відавочны спад узроўню беларускага дзюдо пасля перамогі Ігара Макарава на Алімпійскіх гульнях 2004 года.

— Атрымалася так, што дарослыя спартсмены тады паказвалі добрыя вынікі, але за імі не было моладзі. Потым яна з'явілася, але не змагла на такім жа высокім узроўні перайсці ў дарослы спорт. Пасля Гульняў у Лондане наша дзюдо трапіла ў яму. Зноў жа ў камандзе пастаянна ўзнікалі нейкія канфлікты. Асабіста для мяне гэтыя чатыры гады перад Алімпіядай у Бразіліі былі вельмі складаныя: мяняліся трэнеры, некалькі разоў мяняліся правілы.

Цяпер ужо адбылася змена пакаленняў, не толькі спартсменаў, але і трэнераў. Прыйшлі маладыя настаўнікі з сучаснымі падыходамі, новымі павевамі, сталі з'яўляцца клубы. Мой асабісты трэнер — Леанід Фёдаравіч Свірыд — цудоўны чалавек і вялікі прафесіянал. Цяпер у нацыянальнай камандзе стварылася вельмі камфортная абстаноўка, разуменне паміж спартсменамі і трэнерамі, добрая атмасфера. Гэта было відаць на чэмпіянаце Еўропы, калі зборная на адным з маіх паядынкаў заскандзіравала «Беларусь, Беларусь», яны перакрычалі залу на некалькі тысяч чалавек. Я думаю, калі такімі ўдарнымі сіламі і калектывам мы падыдзем да алімпійскага адбору, можам разлічваць не на адну і не на дзве ліцэнзіі ў Токіа.

## «Як толькі сказаў сабе «не магу», ты прайграў»

Марына адзначае, што сёння наймацнейшымі ў дзюдо з'яўляюцца родапачынальнікі гэтага віду спорту — японцы, на добрым рахунку расіяне, ды і еўрапейскія прадстаўнікі становяцца ўсё мацнейшымі.

**«Высакакласны спартсмен, таленавіты чалавек павінен знаходзіць час на ўсё».**

— Лічу, што залог поспеху ў нашым відзе спорту — гэта парадак, таму што парадак, як правіла, б'е клас. Парадак у галаве, у сваіх дзеяннях. Вялікае значэнне мае псіхалогія: ты можаш быць супертэхнічным і моцным у фізічным плане, але быць баязлівым — і тады наўрад ці дасягнеш выніку. У кожнага спартсмена ёсць моцныя бакі, я, напрыклад, не асабліва кідковы барэц, але здольная цярпець і ў фізічным, і ў псіхалагічным плане. У сутычцы, дзе фізічна складана, на першы план выходзіць псіхалогія, як толькі ты сказаў сабе «не магу», ты прайграў.

Гаворачы пра максімум, якога хацелася б дасягнуць у кар'еры, Марына прызнаецца, што марыць аб алімпійскім медалі, і ўсё роўна якой вартасці ён будзе.

— Я рэальна ацэньваю свае магчымасці, алімпійскі медаль — гэта далёка ідучыя планы, для пачатку на Гульні трэба адабрацца, таму што, як правіла, алімпійскі адбор у 10 разоў складаней за сам турнір. У жанчын на Алімпіяду трапляе 14 чалавек з больш чым 100 спартсменак.

## «Калі ў камандзе няма ўрача, галоўны ўрач я»

Спецыялісты адзначаюць: дзюдо досыць траўманебяспечны від спорту, у асноўным пакутуюць галёнкаступнёвыя суставы, калені, плечы, локці і пальцы.

— Калі з намі ў камандзе няма ўрача, галоўны ўрач я. За столькі гадоў ужо навучылася тэйпіраваць усіх, перавязваць, заклейваць. Неяк нават сама адкачвала сабе вадкасць з калена. Бачыла гэтую працэдуру шмат разоў, таму вырашыла паспрабаваць. Атрымалася. Праўда, цяпер такой неабходнасці ўжо няма, у нас у зборнай ёсць вельмі добры ўрач.

Марына ўпэўнена, што яе відам барацьбы можа займацца кожны, нягледзячы на вагу, рост і камплекцыю.

— Я лічу, што гэта вялікі плюс дзюдо. У маёй катэгорыі звыш 78 кг можа змагацца спартсменка 80 кг а можа за дзвесце. Таму дыеты мне не пагражаюць, магу есці, што хачу, хоць, вядома, ёсць межы, якія я стараюся не пераступаць па вазе. Наогул, я — ласун, тарты, піроржныя, цукеркі — гэта маё. Напрыклад, адзін кілаграм цукерак магу з'есці не за раз, але за два дакладна. Аднойчы на зборах вымяняла беларускую каўбасу на ўкраінскія цукеркі *(смяецца)*.

## «Я строгая, сваруся, дзеці мяне баяцца»

Высокія спартыўныя амбіцыі не перашкаджаюць Марыне працаваць трэнерам, з дзецьмі яна займаецца ўжо каля пяці гадоў.

— Спачатку проста дапамагала сваёй сяброўцы, яна толькі пачала працаваць трэнерам і не спраўлялася, а ў мяне характар баявы. Потым у адной са школ прапанавалі паспрабаваць трэніраваць самой, я была ўжо на 3-м курсе ўніверсітэта фізкультуры. А праз некалькі гадоў са сваімі сябрамі, таксама маладымі трэнерамі, вырашылі арганізаваць клуб дзюдо, які цяпер называецца «Тыгр», ён працуе ўжо год, знаходзіцца ў Мінску на нядрэнным рахунку.

Я строгая, сваруся, дзеці мяне баяцца *(смяецца)*. Складана працаваць з сучасным пакаленнем, у першую чаргу, таму што іх цяжка зацікавіць. Напрыклад, зараз арганізуем набор у лагер, бацькі даюць грошы, а дзеці кажуць: «Я не хачу, буду дома сядзець у камп'ютары». Мне складана для сябе гэта растлумачыць, таму што я плакала, калі не ехала ў лагер. Дзеці, вядома, цяпер іншыя, з групы 15 чалавек, у лепшым выпадку адзін умее падцягвацца, што казаць, баяцца залезці на шведскую сценку.

Сама Марына прыйшла ў дзюдо толькі ў 8 класе, да гэтага займалася настольным тэнісам і вольнай барацьбой.

— Мяне ўвогуле не дужа хацелі кудысьці браць, таму што я была такая булачка — маленькага росту з вялікімі шчокамі. Мама была катэгарычна супраць дзюдо, не адпускала на трэніроўкі. Пасля таго, як прыйшлі вынікі, я пачала ездзіць на спаборніцтвы за мяжу, стаўленне, вядома, змянілася. Цяпер бацькі ганарацца мной. Першае, што робіць тата, калі прыходзяць госці, — адкрывае дзверы ў мой пакой і кажа: «Паглядзіце, у мяне дачка дзюдаістка». А там усё ўвешана фатаграфіямі, медалямі, кубкі стаяць.



Марына — чалавек, які хварэе сваёй справай, яе хвалюе не толькі ўласная кар'ера, але і папулярнасць дзюдо ў краіне ў цэлым.

— Я выйграла чэмпіянат Еўропы, і, думаеце, гэта дзесьці неяк прагучала? Мінімальна! У аэрапорце мяне сустрэў адзін журналіст з «ВаенТБ». Беларускаму дзюдо не хапае рэкламы, гэта вельмі крыўдна.

## «На дыскатэцы была чатыры разы, два з іх мяне не пусцілі»

А вось тое, што прафесійны спорт на няпэўны час патрабуе адкласці асабістае жыццё, Марыну не палохае, яна сцвярджае, што самае галоўнае — правільна расставіць прыярытэты.

— Высакакласны спартсмен, таленавіты чалавек павінен знаходзіць час на ўсё. Зараз я расставіла акцэнты ў бок спорту, у гэтым мяне падтрымліваюць блізкія. Як будзе праз год-два — невядома. Мінулым летам наогул хацела заканчваць са спартыўнай кар'ерай. Няўдалы чэмпіянат Еўропы, там суддзі зрабілі ўсё для майго пройгрышу, быў для мяне велізарным ударам. Я настройвалася на медаль. Пасля няўдачы не спала трое сутак, першы час заплюшчвала вочы, а ў мяне сутычка, як слайд-шоу праносіцца. Толькі адышла ад яго, як мяне чакаў наступны ўдар — не трапіла на Алімпійскія гульні. Ні з-за чаго ў жыцці я так яшчэ не перажывала. Пасля гэтага наогул згубіла сябе і вырашыла пакінуць спорт. Паспрабаваць яшчэ раз мяне ўгаварыў трэнер.

Што датычыцца адпачынку і шумных кампаній, то Марына аддае перавагу спакойнаму баўленню часу.

— Не люблю клубы, вечарыны, нейкія свецкія выхады. Наогул, на дыскатэцы была чатыры разы, два з іх мяне не пусцілі. Я была цвярозая, акуратна апранутая, але... Адзін раз сказалі, што ўстанова перапоўнена, хоць перад намі ў яе пусцілі чалавек 10, а другі раз мы не трапілі ў клуб, бо мае сябры нібыта вельмі гучна размаўлялі.

Усё ж такі я больш люблю адпачынак на прыродзе, шашлыкі. Калі моцна стамляюся, магу з'ехаць на дачу, там лазня, рыбалка.

У завяршэнне нашай размовы Марына Слуцкая падзялілася чаканнямі ад маючых адбыцца буйных турніраў, якія будзе прымаць Беларусь.

— Хакей не вельмі люблю і чэмпіянат свету ў 2014 годзе прайшоў міма мяне. А вось на Еўрапейскіх гульнях у Баку я была, бачыла, як выдатна там усё было арганізавана. Грошай укладзена шмат, асабліва ў цырымонію адкрыцця і закрыцця. Магчыма, нашай краіне столькі сродкаў не спатрэбіцца. У нас жа ўмеюць будаваць піраміды, вазы з гімнастаў. Я жыву ў раёне Трактарнага завода, у іх там нейкі крэатыўны чалавек з'явіўся. Кожны тыдзень святы, феерверкі, лазернае шоу, танцуючыя трактары. Я думаю, калі яны вывезуць гэтыя машыны на стадыён «Дынама», нікому больш нічога і не спатрэбіцца. А калі сур'ёзна, то такія турніры — гэта, перш за ўсё, магчымасць прарэкламаваць сваю краіну, умацаваць яе аўтарытэт і завабіць турыстаў у Беларусь.

■ Экспрэс-навіны

# РЭАЛьная перамога

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра чарговы тур чэмпіянату краіны па футболе, шахматныя турніры, якія праходзяць у Мінску, і развязку футбольнай і гандбольнай Лігі чэмпіёнаў.**

***1. Завяршыўся 11-ы тур чэмпіянату Беларусі па футболе.*** Барысаўскі БАТЭ абыграў магілёўскі «Днепр» — 2:1. Салігорскі «Шахцёр» прымаў у сябе дома футбалістаў «Віцебска» і выйграў — 2:0. З такім жа вынікам мінскае «Дынама» ў Мазыры перайграла мясцовую «Славію», а ў Брэсце дынамаўцы ўзялі верх над наваполацкім «Нафтанам».

Шэраг матчаў скончыўся з нічыйным вынікам: «Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» — 0:0, «Гарадзея» — «Крумкачы» — 1:1, «Гомель» — «Нёман» — 2:2. «Іслач» на сваім полі саступіла «Слуцку» — 1:2.

*Становішча ў групе лідараў:* «Шахцёр» — 26 ачкоў, БАТЭ — 23, «Дынама» (Мінск) — 22, «Слуцк» — 21.

Зараз у чэмпіянаце наступіла паўза, звязаная з матчамі нацыянальнай і маладзёжнай зборных Беларусі. Сустрэчы 12-га тура пройдуць 15—17 чэрвеня.

***2. На сусветным форуме па бліцы і рапідзе сярод кадэтаў беларускія шахматысты заваявалі чатыры залатыя ўзнагароды, адну сярэбраную і адну бронзавую.*** На закрыцці турніру прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі шахмат Кірсан Ілюмжынаў паведаміў, што чэмпіянат свету па бліцы і рапідзе сярод кадэтаў у наступныя два гады таксама прыме Мінск.

Адзначым, што шахматны форум у сталічным Палацы спорту працягваецца чэмпіянатам Еўропы сярод дарослых, ён будзе доўжыцца да 11 чэрвеня.

***3. Мадрыдскі «Рэал» разграміў турынскі «Ювентус» у фінале Лігі чэмпіёнаў — 4:1.*** І стаў першым клубам, хто выйграў гэты турнір двойчы запар, на сёння гэта самы тытулаваны клуб Еўропы, «Рэал» выйграў галоўны турнір 12-ы раз.

***4. Гандбалісты македонскага «Вардара» са Скоп'е ўпершыню сталі пераможцамі Лігі чэмпіёнаў.*** У нямецкім Кёльне ў вырашальным паядынку за галоўны прыз кантынентальнага клубнага гандбола яны ўзялі верх над французскім «Пары Сен-Жэрмен» — 24:23.

У паядынку за 3-е месца розыгрышу чэмпіёнскай лігі венгерскі «Веспрэм» аказаўся мацнейшы за іспанскую «Барселону» — 34:30.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

УНП 191683861

БАНК РАЗВИТИЯ
*Новые возможности*

## ОАО «БАНК РАЗВИТИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

**объявляет о проведении конкурсов инвестиционных проектов по модернизации производственных участков в организациях районной потребительской кооперации, а также строительству объектов розничной торговли в юго-восточном регионе Могилевской области**

Прошедшие отбор заявители смогут получить кредит:

- в белорусских рублях по ставке – 1/2 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, но не более 7,5 процента годовых;
- в иностранной валюте – не более 8,0 процентов годовых (для кредитов в евро или долларах США), не более 11,5 процента годовых (для кредитов в российских рублях);
- на срок до 15 лет;
- с отсрочкой погашения основного долга – не более 1 года после ввода объекта в эксплуатацию.

**Начало подачи конкурсных предложений – 12 июня 2017 года; окончание – 25 июля 2017 года.**

Ознакомиться с конкурсной документацией можно на официальном сайте Банка развития: **brrb.by** (Раздел «Деятельность» – «Финансирование инвестиционных проектов» – «Конкурсный отбор»).

## ОАО «БАНК РАЗВИТИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ»

**объявляет о проведении конкурсов инвестиционных проектов по модернизации деревообрабатывающих производств в юго-восточном регионе Могилевской области**

Прошедшие отбор заявители смогут получить кредит:

- в белорусских рублях по ставке – 1/2 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, но не более 7,5 процента годовых;
- в иностранной валюте – не более 8,0 процентов годовых (для кредитов в евро или долларах США), не более 11,5 процента годовых (для кредитов в российских рублях);
- на срок до 15 лет;
- с отсрочкой погашения основного долга – не более 1 года после ввода объекта в эксплуатацию.

**Начало подачи конкурсных предложений – 12 июня 2017 года; окончание – 17 июля 2017 года.**

Ознакомиться с конкурсной документацией можно на официальном сайте Банка развития: **brrb.by** (Раздел «Деятельность» – «Финансирование инвестиционных проектов» – «Конкурсный отбор»).

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Моготекс»**

**Лот №1. Капитальное строение с инв. №700/С-50167 – Административное здание подсобного хозяйства**, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 87, общ. пл. 510,5 кв. м., фундамент – ж/бетонный, стены – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – рулонная, полы – бетонные, ламинат, линолеум. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000002006531 (право постоянного пользования), площадью 7,3868 га (доля в праве 119/125), расположенный по адресу: Могилевская область, г. Могилев, ул. Гришина, 87, назначение – использование под производственную площадку и содержания и обслуживания гардинного производства.

**Начальная цена продажи: 153 312,00 бел. руб. с учетом НДС**

**Лот №2. Капитальное строение с инв. №700/С-77442 – Склад подсобного хозяйства**, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 87, общ. пл. 108 кв. м.; фундамент – ж/бетонный, стены – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная, полы – дощатые. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000002000082 (право постоянного пользования), площадью 38,3884 га (доля в праве 119/125), расположенный по адресу: Могилевская область, г. Могилев, ул. Гришина, 87, назначение – использование под производственную площадку и содержания и обслуживания гардинного производства.

**Начальная цена продажи: 18 624,00 бел. руб. с учетом НДС**

**Лот №3. Капитальное строение с инв. №700/С-77443 – Теплица**, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 87, общ. пл. 3705 кв. м.; фундамент – ж/бетонный, стены – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное и остекление, крыша – рулонная совмещенная, полы – бетонные, грунт. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000002006531 (право постоянного пользования), площадью 7,3868 га (доля в праве 119/125), расположенный по адресу: Могилевская область, г. Могилев, ул. Гришина, 87, назначение – использование под производственную площадку и содержания и обслуживания гардинного производства.

**Начальная цена продажи: 128 736,00 бел. руб. с учетом НДС**

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Моготекс» УНП 700116054, г. Могилев, ул. Гришина, 87 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – ОАО «Моготекс» УНП 700116054, р/с 3012430310017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код 739 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 21 июня 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка (10% от начальной цены продажи) 20 июня 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 1 месяца со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 3 месяцев со дня подписания договора купли-продажи |

Информация о предыдущем аукционе была размещена в номере газеты «Звязда» от 15.04.2017 г.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25**

Свидетельство о постановке на учет (государственной регистрации, регистрационный номер в ЕГР 192344078) Торгового унитарного предприятия «БортТехСтрой», выданное Минским городским исполнительным комитетом 18.09.2014 г. и печать ТУП «БортТехСтрой» считать недействительными в связи с утерей.

УНН 600033812

Утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№0551574, 0197402, 0194847, 0194848 и серии КС №№8678513, 3479287, 8676686, 8676701 считать недействительными.

УНП 100782388

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Государственному предприятию «Госстройэкспертиза по Минской области» на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»**

| № лота | Описание предмета электронных торгов | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №010617001 | Шкода Октавия А5 Элеганс, номер кузова (рамы) TMBBA41Z662266291, 2006 г. в. Тип ТС – легковой специальный хэтчбек. Разрешенная масса – 1915 кг. Цвет – зеленый металлик. Двигатель – бензин 1,6 л. Пробег по одометру на 17.03.2017 – 199 296 км. Местонахождение: г. Минск, пер. Домашевский, 9 | 1 833,80 | 185,00 |

**Шаг электронных торгов – 5%**

УСЛОВИЯ

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола.
2. Условия оплаты стоимости приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов согласовываются Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи.
3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах электронных торгов.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов

**Дата и время начала проведения электронных торгов 7 июля 2017 г. с 10.00 (по времени на сервере ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

Продавец: государственное предприятие «Госстройэкспертиза по Минской области» 220036, г. Минск, переулок Домашевский, 9. тел./ф. (017) 213-07-20.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.

Электронный адрес ЭТП: http://торги.бел.

